Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 ЛІСТАПАДА 2017 г. ПЯТНІЦА №227 (28591)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Хто яны — адметныя беларусы?**

СТАР. 5



**Маня вылечыць ці... пчолы**

СТАР. 15



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі:**

*«Падатковая аўтаномія можа стаць магутным матывацыйным механізмам для развіцця рэгіёнаў. Рэгіёнам павінна быць выгадна дадаткова прыцягваць у бюджэт даходы. Зрабіць гэта можна за кошт стварэння новых вытворчасцяў, працоўных месцаў. Так званая аўтаномія заключаецца ў тым, каб дадаткова прыцягнутыя ў мясцовыя бюджэты даходы не цягнулі за сабой змяншэння пералічэнняў з рэспубліканскага бюджэту ў рэгіянальны».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.11.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9968 | ▼ |
| Еўра | 2,3635 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0341 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0743 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Акцэнт на здароўе

# У сэрца — новы рытм





Фота БЕЛТА.

**Першыя аперацыі самым малым пацыентам з арытміяй праводзяць на базе РНПЦ дзіцячай хірургіі беларускія ўрачы разам з вядомым расійскім дзіцячым кардыяхірургам Сяргеем ТЭРМАСЕСАВЫМ — спецыялістам Навукова-даследчага клінічнага інстытута педыятрыі імя акадэміка Ю. Я. Вельцішчава Расійскага нацыянальнага даследчага медыцынскага ўніверсітэта імя М. І. Пірагова Міністэрства аховы здароўя Расіі. Праведзеныя аператыўныя ўмяшанні — гэта надзея на радыкальнае вылечванне для тых, хто зараз з прычыны свайго захворвання прымае сур'ёзныя лекавыя прэпараты.**

СТАР. 3

■ Год навукі

# КРЭАТЫЎ ПЛЮС ЖЫЦЦЁВЫЯ СІЛЫ

## Чаму амаладжэнне навуковых кадраў прынцыпова важнае?

**Наколькі рэдкая з'ява для нашай краіны — малады доктар навук? На якім этапе трэба распачынаць выхаванне будучага даследчыка: у аспірантуры, магістратуры або яшчэ ў школе? Ці можна сёння выжыць, займаючыся толькі навукай? Наколькі актуальная для нашай краіны праблема «ўцечкі мазгоў»? Прадстаўнікі акадэмічнай і вузаўскай навукі падзяліліся сваімі меркаваннямі на гэты конт.**

### АДБОР ЭЛІТЫ

— Пытанні падрыхтоўкі інтэлектуальнай эліты застаюцца актуальнымі для ўсіх краін, — падкрэслівае **рэктар Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Ігар ГАНЧАРОНАК.** — За апошні час колькасць навуковых работнікаў у свеце павялічылася на 20 працэнтаў. Іх цяпер прыкладна 8 мільёнаў — гэта насельніцтва еўрапейскай дзяржавы сярэдніх памераў. Значная частка навуковых работнікаў сканцэнтравана ў краінах, якія перажываюць бурнае эканамічнае развіццё: напрыклад, кожны пяты навуковец — жыхар Паднябеснай, 50 працэнтаў усіх аспірантаў рыхтуюцца не ў Еўропе, а ў ЗША, Кітаі і Аўстраліі... У Старым Свеце адчулі, што трэба штосьці змяняць, і, нягледзячы на функцыянаванне на тэрыторыі Еўропы ўніверсітэтаў са шматвяковай гісторыяй і традыцыямі, у 2008 годзе стварылі новую ўстанову адукацыі ўніверсітэцкага тыпу — Еўрапейскі тэхналагічны інстытут, галоўная задача якога — рыхтаваць вучоных для еўрапейскага рэгіёна, які пазіцыянуецца як рэгіён інавацыйнага кірунку, дзе навука, адукацыя і бізнес складаюць трыяду развіцця. Кітайская Народная Рэспубліка таксама стварыла новыя тыпы ўніверсітэтаў, якія займаюцца падрыхтоўкай навуковых кадраў.

СТАР. 14

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# Дынаміка станоўчая

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам кіраўніка справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Віктара Шэймана.**

Як паведамляе прэс-служба Прэзідэнта, кіраўнік спраў далажыў пра дзейнасць падпарадкаванага яму ведамства, у тым ліку пра вынікі работы за дзевяць месяцаў. Паводле яго слоў, у цэлым назіраецца добрая дынаміка ў рабоце ведамства, пастаўленыя задачы выконваюцца.

Падчас сустрэчы былі ўзгоднены новыя кірункі работы Упраўлення справамі, у прыватнасці па стварэнні прадпрыемстваў у фармацэўтычнай галіне, а таксама па вытворчасці і перапрацоўцы індычыны. Акрамя таго, абмеркаваны перспектывы работы ведамства ў 2018 годзе.

Прэзідэнт паставіў задачу больш актыўна выбудоўваць эканамічнае ўзаемадзеянне з краінамі афрыканскага кантынента. Кіраўнік дзяржавы таксама даручыў прапрацаваць пералік перспектыўных праектаў супрацоўніцтва з Індыяй, каб выйсці на стварэнне сумесных прадпрыемстваў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# Прафесіяналізм як ёсць

## Кіраўнік дзяржавы правёў рабочую сустрэчу з міністрам унутраных спраў

**Абмяркоўваліся як пытанні бягучай работы ведамства, так і працаўладкаванне звяроленых, а таксама нядаўняя аперацыя па абясшкоджванні рабаўніка банка ў Магілёве.**

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што перш за ўсё яго цікавіць аналітычны бок работы міністэрства.

— У сувязі з гэтым тэндэнцыі ў грамадскай бяспецы — перш за ўсё. Што насцярожвае? Гэта галоўнае. Каб я разумеў, на што павінен звярнуць увагу, — адзначыў кіраўнік краіны.

У шэрагу іншых пытанняў Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, у якім стане справы ў людзей, што трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю, — звяроленых:

— Як яны заняты працай? Памятаеце, калі вы толькі сталі міністрам, у нас была праблема з занятасцю. Як зараз там справы ідуць?

Ігар Шуневіч, акрамя таго, што ўзначальвае Міністэрства ўнутраных спраў, выконвае і пэўную грамадскую работу — узначальвае Беларускае фізкультурна-спартыўнае таварыства «Дынама». Спытаў Прэзідэнт і пра гэтую працу кіраўніка ведамства:

— Што ў нас з таварыствам «Дынама» і, у прыватнасці, з яго асноўным кірункам дзейнасці — хакейным клубам «Дынама»? На што мы можам разлічваць? Пакуль яшчэ казаць пра стабільнасць рана... І ці выйдзем мы на тыя рубяжы, якія нам абяцаныя трэнерамі і кіраўнікамі гэтага клуба? Адным словам, што там адбываецца?

Падчас сустрэчы міністр прадэманстраваў кіраўніку дзяржавы два ўзоры хакейных клюшак, якія былі выраблены на базе крымінальна-выканаўчай сістэмы МУС, — з пластыку і з дрэва. У хуткім часе яны пачнуць прадавацца масава.

* * *

Асобную ўвагу кіраўнік дзяржавы ўдзяліў нядаўняму здарэнню ў Магілёве.

**У тэму**

**Ігар ШУНЕВІЧ, міністр унутраных спраў:**

— У цэлым мы зарэгістравалі менш злачынстваў амаль на 8%, чым у мінулым годзе. Гэта выклікае такі лёгкі аптымізм. Але я падкрэсліў бы, што вынік, які мы сёння атрымалі, — гэта дзейнасць у цэлым усёй сістэмы ўлады ў краіне і не толькі і не столькі Міністэрства ўнутраных спраў. Увесь комплекс тых мер, які былі прыняты ў дзяржаве, дазволіў сёння атрымліваць такі эфект. Цяпер грамадская бяспека ў краіне не патрабуе сур'ёзных карэкціровак — ні на заканадаўчым, ні на арганізацыйным узроўні.

— І вам, і хлопцам з Магілёўскай вобласці вельмі дзякую за той прафесіяналізм, які праявілі пры затрыманні асабліва небяспечнага злачынцы, які захапіў адно з аддзяленняў банка і імкнуўся ўзяць у заложнікі людзей. Гэта была адна з лепшых аперацый, — заявіў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў: на падобныя злачынствы адказ павінен быць адпаведным.

— Рэакцыя павінна быць самая жорсткая, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, і супрацоўнікі АМАПа, і супрацоўнікі міліцыі дзейнічалі бліскуча, таму ён, кіраўнік дзяржавы, прыняў рашэнне аб іх узнагароджанні.

Ігар Шуневіч паведаміў, што падчас гэтай аперацыі сыграў станоўчую ролю эксперымент, праведзены зусім нядаўна ў МУС. Так, вядома, што там ёсць спецпадраздзяленне па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз». У міністэрстве вырашылі, што ў кожнай вобласці на базе АМАПа будуць створаны мікрападраздзяленні, якія будуць трэніраваць байцы «Алмаза». «Для таго каб здзяйсняць дзеянні, падобныя гэтым, — да прыбыцця асноўных сіл, асноўнай групы, — расказаў міністр унутраных спраў. — У гэтым выпадку АМАП сыграў ролю падраздзялення па барацьбе з тэрарызмам і выканаў гэтую задачу».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Дзяржава і бізнес

# ПРАДПРЫМАЛЬНІКАМ ДАЛІ ДАБРО

**Прэзідэнт Аляксандр ЛУКАШЭНКА падпісаў дэкрэт «Аб развіцці прадпрымальніцтва». Паводле інфармацыі прэс-службы кіраўніка дзяржавы, ключавы дакумент аб лібералізацыі і паляпшэнні бізнес-клімату прадугледжвае кардынальнае змяненне механізмаў узаемадзеяння дзяржаўных органаў і бізнесу, памяншае верагоднасць умяшання службовых асоб у працу прадпрымальнікаў і аптымізуе механізмы самарэгулявання бізнесу, яго адказнасць за сваю працу перад грамадствам. Мінімальна неабходны ўзровень кантролю з боку дзяржавы пры гэтым захоўваецца.**

Дзеянне дакумента ахоплівае сферы, у якіх засяроджана каля 95% малога і сярэдняга бізнесу: бытавыя, турыстычныя, сацыяльныя паслугі, дзейнасць у сферы гандлю і грамадскага харчавання, перавозак пасажыраў і багажу, вытворчасць прадукцыі, будматэрыялаў і іншыя. Цяпер для таго, каб заняцца гэтымі відамі дзейнасці, дастаткова будзе падаць адзінае апавяшчэнне ў выканкам праз службу «Адно акно» альбо з дапамогай партала электронных паслуг. Займацца заяўленым відам дзейнасці можна будзе ўжо на наступны дзень. Дэкрэтам таксама зацверджаны агульныя патрабаванні пажарнай бяспекі, у галіне аховы навакольнага асяроддзя і ветэрынарыі да размяшчэння, наладжвання, абсталявання, утрымання і эксплуатацыі капітальных пабудоў, ізаляваных памяшканняў, санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні. Палажэнні іншых тэхнічных нарматыўных прававых актаў, якія змяшчаюць патрабаванні ў гэтай сферы, цяпер будуць насіць для прадпрымальнікаў асабліва рэкамендацыйны характар да іх адмены.

**Дырэктар дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі Пётр АРУШАНЬЯНЦ** лічыць, што дэкрэт з'яўляецца вынікам эфектыўнай сумеснай работы дзяржаўных органаў і бізнесу. На яго думку, прынясце дэкрэта не толькі прывядзе да сур'ёзнага спрашчэння дзейнасці, але і да зніжэння выдаткаў з-за меншай колькасці патрабаванняў да прадпрыемстваў. Гэта пазітыўна паўплывае на зніжэнне сабекошту прадукцыі. У дакуменце таксама замацоўваюцца такія важныя прынцыпы, як самарэгуляванне бізнесу, накіраванасць работы кантралюючых органаў на прафілактыку правапарушэнняў. Дырэктар дэпартамента па прадпрымальніцтве Мінэканомікі таксама адзначыў, што першыя вынікі прынясця дакумента будуць бачныя хутка.

**Старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва, старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў Уладзімір КАРАГІН** ацэньвае гэты стратэгічны дакумент як добрую платформу для развіцця дзелавой ініцыятывы ў краіне. Прынясце дэкрэта прывядзе да скарачэння рознага роду адміністрацыйных працэдур, якія завышаюць кошт вядзення бізнесу, і гэта адпаведная заява інвестарам, што ў краіне робіцца стаўка на развіццё прадпрымальніцтва.

Як ключавы дакумент усяго пакета нарматыўных прававых актаў па спрашчэнні ўмоў вядзення бізнесу дэкрэт сістэматызуе ўсе падпісаныя раней дакументы. Яго прынясце стварае добрыя асновы для далейшага дыялогу бізнесу і ўлады.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

■


**ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ**

| | |
|---|---|
| Полное наименование и местонахождение, контактный телефон Покупателя акций | Открытое акционерное общество «Ремонтно-строительное управление бытового обслуживания населения». Минский район, промузел Колядичи, ул. Бабушкина, д. 76, пом. 3, комн. 168, контактный телефон +375296083333 |
| Цель приобретения акций | Уменьшение размера уставного фонда и аннулирование акций |
| Полное наименование и местонахождение Эмитента, акции которого приобретаются | Открытое акционерное общество «Ремонтно-строительное управление бытового обслуживания населения». Минский район, промузел Колядичи, ул. Бабушкина, д. 76, пом. 3, комн. 168 |
| Количество акций, которое намеревается приобретать Покупатель | 870 простых (обыкновенных) акций |
| Цена, по которой Покупатель намерен приобретать акции | 154,00 (сто пятьдесят четыре) белорусских рубля |
| Срок, форма и порядок оплаты акций | Путем безналичного перечисления денежных средств на банковский счет акционера – продавца акций в срок по 28 февраля 2018 года |
| Срок перечисления акционерами-продавцами акций на счет «депо» | В течение трех банковских дней с момента регистрации договора купли-продажи акций у профучастника |
| Адрес, по которому будут совершаться сделки купли-продажи акций | Минский район, промузел Колядичи, ул. Бабушкина, д. 76, пом. 3, комн. 168 |
| Срок предоставления предложений акционеров о продаже акций | С 21 ноября 2017 года по 12 декабря 2017 года |
| Срок начала и окончания приобретения акций (заключения договоров купли-продажи акций) | С 21 декабря 2017 года по 31 января 2018 года |
| Расходы по регистрации договоров купли-продажи акций | Расходы по регистрации договоров купли-продажи акций принимает на себя Покупатель УНП 100079341 |


■ Парламенцкі дзённік

# ЗАМЕСТ ПАКАРАННЯ — ПРАФІЛАКТЫКА

## Цяпер мера канфіскацыі маёмасці будзе выкарыстоўвацца радзей

**Учора адбылося чарговае пасяджэнне трэцяй сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, на якім дэпутаты разгледзелі 8 пытанняў. Сярод іх — законапраект, які датычыцца лібералізацыі бізнесу і паляпшэння ўмоў для яго вядзення. Парламентарыі прынялі ў першым чытанні папраўкі ў Кодэкс аб адміністрацыйных парушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях.**

**Вадзім ІПАТАЎ, дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў,** адзначыў, што законапраект істотна скарачае сферу прымянення канфіскацыі маёмасці і пераносіць акцэнт на прафілактычныя меры. Пасля ўступлення ў сілу паправак канфіскоўваць тавар у прадпрымальнікаў цяпер стануць значна радзей: часцей будзе ставіцца пытанне аб кампенсацыі нанесенай шкоды, каб даць у далейшым магчымасць уцягнуць маёмасць у легальны абарот з выплатай адпаведных падаткаў. Разам з тым канфіскацыя для прадпрымальнікаў, як і раней, будзе прадугледжана за маёмасць, забароненую да абароту: экстрэмісцкія матэрыялы, недабраякасная прадукцыя, фальсіфікаваны алкаголь і інш.

**Уладзіслаў ШЧЭПАЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па эканамічнай палітыцы,** станоўча ацаніў змены, якія ўнесены ў законапраект да першага чытання, але лічыць іх недастатковымі. «Ёсць пэўныя артыкулы, якія набілі аскому нашаму бізнесу», — лічыць старшыня камісіі. Ён прапаноўвае перагледзець пытанне, якое датычыцца магчымасці канфіскацыі ці кратнага штрафу ў асобных выпадках. Вадзім Іпатаў станоўча ацаніў агучаную ідэю і прапанаваў яе ўнесці падчас другога чытання. **Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі,** у сваю чаргу, скіраваў дэпутатаў ніжняй палаты парламента не зацягваць з разглядам законапраекта, які трэба ўхваліць да канца бягучай сесіі.

Падчас пасяджэння дэпутаты таксама падтрымалі законапраекты, датычныя міжнародных дагавораў і адносін, тарыфаў на прыродны газ, геаграфічных назваў і навуковай сферы.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# ДОПІНГУ — НЕ

**На мінулым тыдні Беларусь ратыфікавала дадатковы пратакол да Канвенцыі супраць прымянення допінгу. Пра гэта нагадаў Баляслаў ПІРШТУК, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, на сустрэчы з Андрэа РЫГОНІ, дакладчыкам па Беларусі камісіі Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ) па палітычных пытаннях і дэмакратыі, членам Палаты дэпутатаў Парламента Італіі. Беларускі віцэ-спікер адзначыў: «Пры гэтым мы бяром на сябе дадатковыя абавязкі і тым самым пацвярджаем, што мы, безумоўна, зацікаўлены ў чысціні спорту».**

Баляслаў Пірштук паведаміў, што ў адносінах з Саветам Еўропы ў апошні час вызначыўся прагрэс. У прыватнасці, працуе план дзеянняў па супрацоўніцтве на 2016—2017 гады. Беларусь ставіцца да яго з адказнасцю. Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў спадзяецца, што план будзе распаўсюджвацца яшчэ і на 2018 год. Беларускі бок зацікаўлены ў далучэнні да канвенцый і пагадненняў Савета Еўропы. Пазітыўна ацэньваецца такі крок, як запрашэнне беларускіх дэпутатаў на пасяджэнні ПАСЕ. «Са студзеньскай сесіі дэлегацыя, якую вы (Беларусь. — **Аўт.**) накіруеце ў Страсбург, будзе мець магчымасць удзельнічаць у абмеркаванні ўсіх пытанняў у рамках палітычнай камісіі. Гэтае рашэнне — скачок іншага ўзроўню ў нашых адносінах», — адзначыў яго субяседнік Андрэа Рыгоні.

Да таго ж італьянскі палітык сказаў, што бачыць задачу наблізіць Беларусь да стандартаў і каштоўнасцяў Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы. Ён звярнуў увагу на пазітыўныя крокі ў гэтым кірунку і падкрэсліў, што канчатковая мэта — увесці Беларусь у Савет Еўропы. Пры гэтым, вядома, паўстала пытанне смяротнага пакарання. Яно стане тэмай сённяшняй сустрэчы з рабочай групай Нацыянальнага сходу па вывучэнні праблематыкі смяротнага пакарання.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■


**ОАО «Белкард», г. Гродно, сдает в аренду по адресу: г. Гродно, ул. Курчатова, 1а:**

– административный корпус (2–6-й этажи общей площадью 2454 м²);

– производственный корпус площадью 485,7 м² ( смотровые ямы, г/п мех.);

– производственную площадь 3 985,2 м² (кран-балки г/п 2 т);

– производственную площадь 300,3 м² (вход изолирован от территории предприятия);

– производственную площадь 1712,7 м²;

– отдельные помещения в административно-бытовом корпусе (1-й этаж – 73,8 м²; 2-й этаж – 35,5 м²; 34,6 м²; 17,1 м²; 10,8 м²);

– столовую общей площадью 1484,3 м² (зал – 422,3 м²; кухонные помещения – 284,3 м²; холл – 175,6 м²; буфет – 97,8 м²; подвал – 504,3 м²).

За информацией обращаться по тел. 80152 52-16-14.

УНП 500013879

■ Грамадства

# ЧЫСЦІНЯ ПА-ІТАЛЬЯНСКУ

## Лепшы дворнік Цэнтральнага раёна расказала пра сваё падарожжа

**Убачыць балкончык Джульеты ў Вероне, разгледзець роспіс сабора Святога Пятра ў Ватыкане, падтрымаць нахіленую вежу ў Пізе — гэта і многае іншае стала часткай прыза для пераможцы конкурсу на званне «Лепшы дворнік Цэнтральнага раёна г. Мінска» Ганны ДЗЕСЮКЕВІЧ. Пра свае ўражанні ад паездкі ў Італію супрацоўніца ЖЭУ распавяла калегам і журналістам за кубачкам капучына.**

Дарэчы, фармат сустрэчы за кубачкам духмянага кававага напою апошнім часам стаў фірмавым ноу-хау Цэнтральнага раёна сталіцы. Мерапрыемства таксама атрымалася прымеркаваць да Дзён італьянскай кухні, якія праходзяць зараз у Мінску.

Конкурс на званне лепшага супрацоўніка раёна ў сферы клінінгу, як модна цяпер казаць, сімвалічна стартаваў у Дзень працы. На ўдзел было пададзена больш за 40 заявак, пасля чаго афіцыйная група раёна ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» распачала адкрытае галасаванне, у якім на працягу месяца бралі ўдзел мясцовыя жыхары. У выніку было адабрана 20 удзельнікаў, якія набралі найбольшую колькасць «лайкаў». Аднак у канкурэнтнай барацьбе ўсіх абышла дасведчаная Ганна Дзесюкевіч, якая займаецца абслугоўваннем дома №97 па праспекце Пераможцаў. Там жа напярэдадні 950-годдзя Мінска падчас свята двара адбылося яе ўрачыстае ўзнагароджанне.





Прыз адміністрацыя раёна разам з партнёрам падрыхтавала нестандартны, але ён дакладна натхніць на новыя працоўныя поспехі, — дзевяцідзённую паездку ў Італію з заездам у Прагу. Па прызнанні **кіраўніка адміністрацыі Цэнтральнага раёна Ігара БУЗОЎСКАГА,** мэта была не толькі ў тым, каб пазнаёміцца з уражальнай архітэктурай Апенінскага паўвострава, але і ў тым, каб поглядам прафесіянала ацаніць працу камунальных службаў.

І Ганна яе сапраўды ацаніла, заўважыўшы, што маленькія гарады досыць акуратныя, а вось мегаполісам да чысціні мінскіх вуліц вельмі далёка. Як падчас сустрэчы ў Рыме расказала віцэ-консул Рэспублікі Беларусь у Італіі, абслугоўваннем жылога фонду краіны займаюцца прыватнікі. Узяць на сябе гэты абавязак за плату можа як чалавек з боку, так і адзін з жыхароў дома. Пры гэтым зарплата клінера можа даходзіць да дзвюх тысяч еўра ў месяц. Смеццеправодаў у дамах няма, за парушэнне правілаў сарціроўкі — вялізны штраф, таму ўсе іх строга выконваюць. У нас пакуль сітуацыя з гэтым пытаннем не настолькі аптымістычная, але, паводле слоў Ганны Дзесюкевіч, яна паляпшаецца з месяца ў месяц.

Што да сакрэтаў паспяховай працы, рабочая па комплексным прыбіранні і ўтрыманні домаўладанняў прызнаецца, што іх у яе няма: трэба проста любіць тое, чым займаешся, і рабіць гэта з душой. Жанчына з радасцю гатовая ўзяць удзел у конкурсе яшчэ раз. А на пытанне пра тое, куды хацела бы адправіцца ў наступнае падарожжа, з усмешкай адказвае: вядома, у Парыж!

На сустрэчы за кубкам капучына прысутнічаў прадстаўнік італьянскага пасольства ў Беларусі Сільвіа Арсіні, які выказаў шчырае захапленне парадкам у беларускай сталіцы. Ён адзначыў, што, нягледзячы на няпростую сітуацыю ў свеце, жыхары Мінска маюць усё для таго, каб адчуваць сябе дастаткова шчаслівымі і абароненымі.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

■

# У сэрца — новы рытм

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сучасны метад лячэння стаў магчымы дзякуючы з'яўленню ўнікальнага абсталявання «Сістэма электрафізіялагічная эндакардыяльная для дзяцей» коштам 600 тысяч рублёў. Медыцынская тэхніка закуплена і пастаўлена ў навукова-практычны цэнтр у межах праграмы «Развіццё дзіцячай інтэрвенцыйнай арытмалогіі ў Рэспубліцы Беларусь» Міжнароднага дабрачыннага фонду дапамогі дзецям «Шанс». Фінансавую падтрымку праграмы забяспечваюць «Газпрам трансгаз Беларусь» і «Белгазпрамбанк».

Паводле слоў **дырэктара РНПЦ дзіцячай хірургіі, галоўнага пазаштатнага дзіцячага кардыяхірурга Міністэрства аховы здароўя Беларусі Канстанціна ДРАЗДОЎСКАГА,** цяпер можна выконваць аперацыі пацыентам з арытміяй — прыроджанай або набытай — значна раней за падлеткавы ўзрост, што было магчыма і дагэтуль, каб праапераванае дзіця магло пайсці ў школу ўжо здаровым і добра адчувала сябе пры розных нагрузках. Пакуль жа кардыяпаталогія пазбаўляе маленькіх хворых шэрагу звычайных радасцяў. Спецыялісты нездарма называюць такіх пацыентаў «дзецьмі на канапе» — з-за іх прывязанасці да дому. Бацькі так хвалююцца за стан малых, што не адпускаюць іх ад сябе ні на крок. Пры гэтым ад нараджэння маленькія пацыенты вымушаны знаходзіцца на медыкаментознай тэрапіі, якая прадухіляе развіццё новых парушэнняў. Усяго ў лісце чакання на сёння каля 400—500 беларускіх дзяцей (лічба пастаянна мяняецца: хтосьці ўжо выйшаў з дзіцячага ўзросту, а нехта тым часам нарадзіўся). З дапамогай новага абсталявання плануецца выконваць па паказаннях каля сотні аперацый у год.

Асноўнай прычынай гібелі дзяцей ранняга ўзросту застаюцца ў першую чаргу прыроджаныя парокі развіцця. Таму адкрыццё ў свой час самога РНПЦ дзіцячай хірургіі сыграла значную ролю ў зніжэнні дзіцячай смяротнасці і інваліднасці, заўважыў **міністр аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Валерый МАЛАШКА.** На яго думку, сацыяльна адказны бізнес робіць магчымым аказанне меддапамогі паводле еўрапейскіх стандартаў, і, трэба спадзявацца, будуць з'яўляцца наступныя сумесныя праекты.

«Газпрам трансгаз Беларусь» і «Белгазпрамбанк» далучыліся да праектаў дабрачыннага фонду «Шанс» некалькі гадоў таму. Разам яны рэалізуюць праграмы «Ранняе выяўленне парушэнняў слыху ў дзяцей», «Удасканаленне аказання дапамогі дзецям з анкалагічнымі захворваннямі» і «Дапамога дзецям з ювенільным рэўматоідным артрытам». У наступным годзе плануецца папоўніць асноўны модуль абсталявання ў цэнтры дзіцячай хірургіі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Брытанія вылецела з топ-5 эканомік свету



Вялікабрытанія апусцілася на шостае месца ў рэйтынгу найбуйнейшых эканомік свету ў 2017 годзе. Пра гэта расказаў канцлер казначэйства краіны Філіп Хэмонд, паведамляе CNN. У рэйтынгу Брытанію апярэдзіла Францыя з аб'ёмам ВУП 2,575 трыльёна долараў, тады як у каралеўства — 2,565 трыльёна. У казначэйстве паказваюць, што, хоць пакуль адрыў невялікі, пазіцыя Францыі ў будучым годзе ўмацуецца. У рэйтынгу МВФ сёлета на першым месцы ЗША (19,4 трыльёна долараў), на другім — Кітай (11,9 трыльёна), на трэцім — Японія (4,9 трыльёна), на чацвёртым — Германія (3,7 трыльёна).

## ІД пазбавілася 95% тэрыторыі ў Іраку і Сірыі

Пра гэта заявіў спецыяльны прадстаўнік генеральнага сакратара ААН у Іраку Ян Кубіш на пасяджэнні Савета Бяспекі. «З лета 2014 года ІД страціла 95% тэрыторыі, якую яна кантралявала ў Іраку і Сірыі, больш за 7,5 млн чалавек былі вызваленыя з-пад яе прыгнёту», — сказаў ён. Па словах эмісара, за перамогу над ІД «давялося заплаціць вельмі высокую цану». Спецпрадстаўнік ААН заклікаў кааліцыю, якую ўзначальвае ЗША, а таксама краіны рэгіёна і міжнародных гульцоў «рашуча працягваць як ваенныя, так і неваенныя намаганні, накіраваныя на тое, каб дапамагчы Іраку атрымаць канчатковую перамогу над ІД і аднавіць стабільнасць» у краіне і ва ўсім рэгіёне.

## Затрыманых саудаўскіх прынцаў катуюць



Затрыманыя прадстаўнікі дзяржаўнай эліты Саудаўскай Аравіі, уключаючы прынцаў, падвяргаюцца катаванням на допытах, піша газета Daily Mail са спасылкай на крыніцу. Да катаванняў датычнае амерыканскае ахоўнае прадпрыемства Academi. Як сцвярджае выданне, у допытах можа ўдзельнічаць асабіста наследны прынц Саудаўскай Аравіі Мухамед бен Салман Аль Сауд. Ён спрабуе раскрыць меркаваную сетку замежных чыноўнікаў, якія атрымлівалі хабар ад прынцаў. Па дадзеных газеты, з банкаўскіх рахункаў затрыманых канфіскавалі каля 194 мільярдаў долараў.

## Школьнікі ў якуцкім Оймяконе пайшлі на заняткі пры мінус 50

Дзеці жыхароў вёскі Оймякон у Якуціі адправіліся на заняткі ў школу пры тэмпературы мінус 50 градусаў па Цэльсіі, паведамляе Ykt.ru. Для адмены ўрокаў у населеным пункце, які называюць зямным полюсам холаду, не хапіла двух градусаў. Як адзначае выданне, у самым Якуцку пры пяцідзесяціградусным марозе школы не працуюць зусім. У снежні мінулага года паведамлялася пра адмену заняткаў і авіярэйсаў у Ханты-Мансійскай аўтаномнай акрузе з-за марозу ў мінус 62 градусы. Аднак гэтая лічба значна саступае рэкорду, усталяванаму ў Оймяконе ў 1938 годзе, калі тэмпература тут апусцілася да мінус 77,8 градуса.

■ Надвор'е

# І пайшоў цёплы дождж ык

## А ў суботу сіноптыкі абяцаюць да 9 цяпла

**Кароткачасовыя ападкі чакаюцца ў Беларусі ў выхадныя, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень па паўднёвым захадзе краіны — да 8 цяпла. У суботу ў нас па краіне распаўсюдзіцца ўмерана цёплая паветраная маса з паўднёвага захаду Еўропы. Чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, у асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. Месцамі чакаецца туман, уначы і раніцай слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да плюс 4 градусаў, толькі па паўднёвым усходзе краіны пры праясненнях паветра астудзіцца да 5 марозу. Тэмпература паветра ўдзень будзе ад нуля да 6 цяпла, у паўднёва-заходніх раёнах павысіцца да плюс 9 градусаў.

Таксама будзе цёпла ў нас і ў нядзелю, калі надвор'е ў краіне будуць вызначаць франтальныя падзелы, якія перамяшчаюцца з Заходняй Еўропы. На большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Удзень у асобных раёнах чакаецца парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да плюс 5 градусаў, удзень — 2—8 цяпла.

Згодна з доўгатэрміновымі прагнозамі айчынных спецыялістаў, у панядзелак тэрыторыя краіны застанецца пад уплывам франтальных падзелаў, за якімі пачне паступаць больш халоднае паветра. Уначы на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень па ўсходзе краіны чакаюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы і раніцай на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да плюс 3 градусаў, днём ад нуля да 5 цяпла. У аўторак па ўсходзе краіны, а днём і ў заходніх раёнах прагназуюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу. Уначы і раніцай на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, удзень — ад мінус 2 да плюс 4 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■

■ Кошт пытання

# Генетычныя экспертызы патанеюць?

**Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз наведала дэлегацыя з Кітая. Яе ўзначаліў намеснік дырэктара Інстытута судовай экспертызы Міністэрства грамадскай бяспекі краіны Ван Гікіянь. Асаблівай тэмай сустрэчы стала закупка беларускімі экспертамі абсталявання з Паднябеснай. Дзякуючы гэтаму адчувальна зменшыцца кошт генетычных даследаванняў.**

— Новую тэхніку і рэагенты мы плануем закупіць налета, — расказаў **намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, галоўны дзяржаўны судова-медыцынскі эксперт Юрый АЎСІЮК.** — Летась мы тэставалі адзін з прыбораў і рэагентаў. Пасля выставы «Чалавек і бяспека» кітайскія калегі пакінулі ў нас свае распрацоўкі на бязвыплатнай аснове. Нашы спецыялісты іх пратэставалі, і ў Паднябеснай была выпушчана новая лінейка прыбораў з улікам нашага досведу. Яны задавальняюць усе нашы патрабаванні. Па сваіх якасцях не саступаюць аналагам з ЗША, якімі карыстаемся цяпер. Але па кошце ніжэйшыя значна, што ў цяперашняй сітуацыі нам дазволіць зэканоміць і бюджэтныя сродкі, і сродкі грамадзян.

Напрыклад, па крымінальных справах генетычныя даследаванні праводзяцца бясплатна. Але калі нехта хоча высветліць бацькоўства, то за гэта давядзецца даплаціць. Цана пытання зараз — каля 300 рублёў. Як зазначыў Юрый Аўсіюк, штогод у Беларусі праводзіцца больш за тысячу падобных даследаванняў. Па словах Вана Гікіяня, кітайскі бок разглядае пытанні супрацоўніцтва па метала- і рэнтгенаграфічных даследаваннях, а таксама экспертыз дакументаў.

Цікава, што ў Беларусі каля 30 працэнтаў генетычных даследаванняў звязана са справамі аб наркотыках. А вось у Кітаі сітуацыя іншая. Ван Гікіянь адзначыў, што 60% генетычных экспертыз у Паднябеснай выяўляюць віноўнікаў крадзяжоў. Разам з тым даследаванні, звязаныя з ужываннем і распаўсюджваннем забароненых рэчываў, складаюць у агульнай колькасці нязначны працэнт. Звязана гэта з тым, што біялагічныя даныя большасці падазраваных ужо маюцца ў адмысловай базе.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

■

НЕРУДПРОМ

# На чыіх плячах

**70-гадовы юбілей адзначае ААТ «Нярудпрам» — заснавальнік няруднай прамысловасці ў Рэспубліцы Беларусь і найбуйнейшае прадпрыемства краіны па аб'ёмах і наменклатуры ў вытворчасці пяску, гравію, шчэбеню і дарожных сумесяў. Карэспандэнт «Звязды» гутарыць з генеральным дырэктарам Аляксандрам ЛОЙКАМ.**



— Не буду «прысвойваць» свята, бо сямідзесяцігоддзе ў гэтыя дні адзначаем не толькі мы, а ўся галіна няруднай прамысловасці Беларусі, — падкрэслівае Аляксандр Анатолевіч. — А фундаментам галіны сапраўды стала наша прадпрыемства, што прыемна ўсведамляць. Усе гэтыя гады мы дабывалі і перапрацоўвалі пясчана-гравійную сумесь і выпускалі прадукцыю для будаўнічага комплексу: пясок, гравій, шчэбень. А на іх аснове — дробныя і буйныя напаўняльнікі пры вытворчасці бетонных вырабаў, будаўнічых раствораў, сухіх сумесяў, для ўладкавання асновы і пакрыццяў аўтадарог і аэрадромаў.

Людзі старэйшага пакалення памятаюць, што асабліву запатрабаванасць нярудныя матэрыялы набылі ў 60-я гады, у перыяд бурнага росту індустрыяльнага жыллёвага будаўніцтва, панэльнага домабудавання. З ростам аб'ёмаў вытворчасці асвойваліся новыя радовішчы пясчана-гравійнай сумесі, удасканальвалася тэхналогія яе здабычы і перапрацоўкі, будаваліся новыя драбільна-сартавальныя заводы. Удасканальвалася землярыйная і пагрузачная тэхніка, электра- і механічнае абсталяванне. Рос тэхнічны ўзровень вытворчасці, а з ім кваліфікацыя персаналу.

***— Звяртае на сябе ўвагу вось гэтая лічба, Аляксандр Анатолевіч: да 1990 года вытворчая магутнасць вашага прадпрыемства дасягнула 5 млн кубічных метраў у год.***



— А вось наступнае няпростае дзесяцігоддзе распаду негатыўна адбілася на аб'ёмах вытворчасці. Але калектыў вытрымаў, уцалеў у складаныя часы, больш таго, удасканальваўся і абнавіў тэхніку і тэхналогіі. Можна сказаць, была праведзена аптымізацыя і калектыву, і самой вытворчасці.

Павелічэнне попыту на прадукцыю «Нярудпрама» зноў пачалося ў пачатку 2000-х гадоў, што адбілася на росце аб'ёмаў выпуску прадукцыі, нашы заводы перайшлі на двух- і трохзменны рэжым працы. Зараз попыт на прадукцыю ААТ «Нярудпрам» у Мінску і сталічнай вобласці знаходзіцца на стабільна высокім узроўні, а па некаторых пазіцыях і ўзрастае. Скажам, у сувязі з будаўніцтвам другой узлётна-пасадачнай паласы ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск-2» і індустрыяльнага парка «Вялікі камень» асабліва запатрабаваны пясок першага, другога класаў і абагачаны. Прычым асаблівая ўвага ўдзяляецца іх якасці. Добра, што ў свой час намі быў асвоены выпуск пяску дробнай фракцыі, што дазволіла палепшыць якасць тынковачных і сухіх будаўнічых сумесяў.

***— А хто перш за ўсё забяспечвае якасць — людзі ці тэхніка?***

— Людзі, належным чынам узброеныя спецыяльнай тэхнікай. Зараз такой колькасці спецыялізаванай тэхнікі, як у нас, няма ні ў адной будаўнічай арганізацыі. «Нярудпрам» эксплуатуе больш 50 адзінак землярыйнай і пагрузачнай тэхнікі — бульдозераў, пагрузчыкаў і экскаватараў, мабільныя сартавальныя комплексы, а кожны з іх — завод на калёсах, а таксама ўласны аўтатранспарт (самазвалы, аўтакраны, аўтавышкі і гэтак далей) — таксама больш за 50 адзінак. На нашых стацыянарных драбільна-сартавальных заводах і мабільных установках укаранёны цалкам сучасныя тэхналогіі, якія дазваляюць атрымліваць прадукцыю, што адпавядае ўсім патрабаванням нарматыўных дакументаў. Побач з традыцыйнымі будаўнічымі матэрыяламі асвоены выпуск кварцавага фільтруючага пяску ўласнай распрацоўкі, ён спажываецца, у прыватнасці, для ачысткі пітной вады ці як кармавая дабаўка для жывёлы. І, што надзвычай важна, створана новая вытворчасць дарожных сумесяў.

***— Мне здаецца, што заслугоўвае ўпамінання і шэраг іншых дасягненняў вашага калектыву за апошнія гады.***

— Калі вы маеце на ўвазе тыя мабільныя ўстаноўкі, якія я коратка ўпамянуў, то яны сапраўды заслугоўваюць асобнага каментарыя. Бо дазволілі скараціць затраты на перавозкі ўнутры кар'ераў на чвэрць. А летась была ўведзена сістэма кантролю ўзроўню паліва ў баках землярыйнай і пагрузачнай тэхнікі. Мы атрымалі магчымасць значна знізіць спажыванне дызельнага паліва. І гэта пры тым, што арганізавана дастаўка прадукцыі спажыўцам уласным транспартам. І мы ўвайшлі ў пяцёрку буйнейшых перавозчыкаў нярудных матэрыялаў у сталічным рэгіёне.

***— Цікава, як усё гэта суадносіцца з тэхнічнай узброенасцю першых гадоў працы калектыву?***

— Калі пачалося аднаўленне пасляваеннага Мінска, то першым прадпрыемствам, створаным для забеспячэння горада будматэрыяламі, быў кар'ер «Тарасава», які фактычна стаў асновай галіны — беларускай няруднай прамысловасці, і з якім мы звязваем пачатак біяграфіі свайго калектыву. Ён запрацаваў у чэрвені 1947 года, і аснашчэнне складалася з экскаватара з каўшом ёмістасцю 0,5 кубічнага метра, некалькіх аўтамабіляў і нерухомых сітаў для ручнога сартавання здабытай сумесі. У 1948 годзе быў пабудаваны новы, цяпер ужо механізаваны кар'ер «Навінкі», на якім тэхналагічны працэс забяспечвалі металічны прыёмны бункер, лентачны канвеер, сартавальны грохат барабаннага тыпу, бункеры-накапляльнікі. Працавалі экскаватар і бульдозер. Прыкладна гэтак жа былі ўзброены і кар'еры «Лагойскі», «Пастухі» і іншыя. Але галіна паступова пераўзбройвалася і пераасняшчалася. Асобнай старонкай гісторыі сталі спецыфічныя вытворчыя адзінкі — драбільна-сартавальныя заводы. Гэта ўжо сапраўдныя інжынерныя збудаванні, добра аснашчаныя, з асаблівымі ўмовамі работы. На іх магутных установках бесперапынна перапрацоўваюцца дзясяткі тон пароды. Першым такім драбільна-сартавальным заводам стала наша «Заслаўе», размешчанае пад Мінскам. Шкада, што зараз радовішчы пяскоў, на якіх ён працаваў, вычарпаны, і вядзецца паступовая ліквідацыя завода. Асноўная нагрузка лягла на нашы заводы «Мінскі» і «Крапужына». ДСЗ «Мінскі» выпускае пяскі будаўнічыя чатырох класаў, шчэбень, гравій і дарожныя сумесі. Аб'ём выпуску летам перавышае 5 тысяч кубічных метраў у суткі. ДСЗ «Крапужына» выпускае пясок будаўнічы 3 класаў, таксама шчэбень і гравій, дарожныя сумесі і пясок кварцавы фільтруючы для ачысткі вады. Адна бяда — сыравінныя запасы яго таксама амаль вычарпаны.

**«Мы пачынаем працаваць у палове восьмай, а ўжо ў пяць гадзін раніцы выстройваецца чарга па нашу прадукцыю. Да пачатку работы ў гэту чаргу становяцца 50—60 грузавікоў».**

***— Такім чынам, з кароткага экскурсу ў мінулае мы з вамі вярнуліся ў нашы дні...***

— І лагічным будзе назваць нейкія асноўныя паказчыкі нашай работы. Штодзённы аб'ём выпуску і адгрузкі гатовай прадукцыі ў летні перыяд складае 12—14 тысяч кубічных метраў. На працягу сутак у двух нашых кар'ерах загружаем у сярэднім не менш за адну тысячу аўтамашын спажыўцоў. Выдзеленыя зямельныя ўчасткі радовішчаў дазваляюць прадпрыемству выпускаць 2,4—2,5 мільёна кубічных метраў нярудных будаўнічых матэрыялаў у год і на 70—75% забяспечваць (толькі нашымі намаганнямі) патрэбы будаўнічага комплексу Мінска і вобласці ў нярудных будаўнічых матэрыялах.



(Працяг на 13-й стар.)

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

**Ужо сёння ўвечары, у 20.10, на міжнародным тэлеканале «Беларусь 24» можна ўбачыць першы выпуск новай праграмы «Беларусы». Таксама ён будзе даступны і анлайн на сайце http://belarus24.by. Здавалася б, усё проста, — перадача пра беларусаў. Аднак часам тое, што падаецца відавочным і простым, аказваецца досыць складаным. Якія яны, самыя цікавыя прадстаўнікі народа, хто і чаму іх выбіраў? Мы звярнуліся да аўтара праекта Алены НЕКРАШЭВІЧ, каб разабрацца ва ўсіх нюансах. Аднак размова павярнула ў вельмі цікавае рэчышча...**

■ Шануй сваё!

# «КОЖНЫ РАЗ ТЫ БЫЦЦАМ НАБЫВАЕШ КВІТОК...»

## Пра самых адметных людзей, пакліканне і працу тэлежурналіста

***— Спадарыня Алена, з аднаго боку, расказаць пра беларусаў — досыць натуральнае жаданне. Аднак з іншага — мы не заўсёды робім тое, што з'яўляецца відавочным. Як узнікла ідэя праекта «Беларусы», і што ён сабой уяўляе?***

— Гэта праграма на 26 хвілін, якая ўяўляе сабой маналогі галоўных герояў. Па сутнасці, там нават няма закадравага тэксту. Мы даём магчымасць удзельніку самому выказацца і распавесці пра сябе. Герой расказвае, чым займаецца, пра сэнс свайго жыцця, пра трагедыі, пра наканаванне і пра тое, як да яго прыйшоў. Гэта культурна-пазнавальная праграма. А наша журналісцкая справа — выбудаваць тэкст так, каб ён быў лагічны і зразумелы.

***— Ці складана раскрыць героя? Вы кажаце, што ён распавядае нават пра патаемнае — натуральна, гэтаму павінна папярэднічаць вялікая праца.***

— Калі ты задаеш навадныя пытанні, то нават па голасе, па інтанацыі можна зразумець, наколькі глыбокія рэчы гучаць, наколькі яны кранаюць героя. Голас робіцца больш нізкі, спакойны. Пэўна, разгаварыць героя нескладана. Імкнешся адшукаць такія тэмы, якія цікавыя апавядальніку, паглыбляешся ў тое, як ён да іх прыйшоў. Напрыклад, наш герой дудар Алесь Лось доўгі час паказваў прадстаўленні батлейкі. Але аднойчы я прачытала, што са сваімі спектаклямі ён бываў у чарнобыльскай зоне — натуральна, гэта не проста тэма лялечнага тэатра. Я задавала адпаведныя пытанні, і герой прыгадваў, як і дзе гэта адбывалася, усплывалі розныя гісторыі... З размовы ў размову ты выбудоўваеш адносіны з героямі. Часам я задаю і правакацыйныя пытанні. Напрыклад, мы здымалі ксяндза Пятра ў Радзівілаўскім палацы, я запытвала, ці не страшна яму спускацца да саркафагаў? Героя трэба зачапіць — асабістым, патаемным.



***— У вас надзвычай добрая падборка герояў. Як вы іх шукалі?***

— Мы выбіралі герояў, з якімі нам самім хацелася б паразмаўляць. Напрыклад, наш дырэктар Аляксандр Мартыненка расказаў, што ў Дзяржынску жыве майстар, які робіць гадзіннікі з дрэва. Мы адразу зацікавіліся і вырашылі здымаць пра яго перадачу. Андрэй Мартынюк займаецца ўнікальнай справай і ўкладвае ў яе шмат працы: размячаць розныя шасцяронкі вельмі няпроста. А ў 1990-м на рынку яму трапілася настройка з артылерыйскага прыцэла. Гэта дазволіла рабіць надзвычай дакладныя механізмы — напрыклад, чарцёж на 1000 дзяленняў. Калі раней на выраб аднаго гадзінніка ў яго ішло тры гады, то цяпер — год. Усе вырабы майстра ўнікальныя, з аўтарскім дызайнам. Напрыклад, ёсць гадзіннік, упрыгожаны... сцэнамі з Шэкспіра! Уявіце самога чалавека, калі яму хочацца гэта зрабіць! Вельмі важна, што ў справе яго падтрымлівае другая палавінка. Іншыя жонкі зазвычай кажуць сваім мужам, каб ішлі зарабляць грошы. А яго жонка станоўча ставіцца да такога занятку. Яшчэ адзін удзельнік перадачы — Алесь Лось. Ён жыве на хутары ў Валожынскім раёне. Цікава, што яшчэ Якуб Колас пісаў пра гэты хутар і сябраваў з яго гаспадарамі. У наш час Алесь Лось на сваёй сядзібе захоўвае беларускасць, служыць нашай гісторыі. Ён адраджае дударства — аб'ездзіў шмат вёсак: жывых дудароў ужо не застаў, затое ўдалося ўбачыць іх дзяцей, людзей, якія займаліся спевамі. Яму найгравалі мелодыі — напрыклад, на скрыпцы — ці проста напявалі тыя мелодыі, што калісьці выконвалі дудары. Штосьці захавалася ў нотах, запісах, але шмат было страчана. Алесю Дудару ўдалося многае аднавіць, занатаваць... Для такіх творцаў іх справа — сэнс жыцця. Сустрэцца з такімі людзьмі — светлымі, яркімі, добрымі — як у царкву схадзіць і падпітацца чысцінёй.. Яны выконваюць прыгожую задуму, сваё служэнне.

***— Як думаеце, наколькі гледачу цікавая форма маналогу?***

— Тут, натуральна, ёсць свае асаблівасці. Гэта цікава, калі герой эмацыянальна прамаўляе. Наш фармат — не дакументальны. Дакументальнае кіно складана глядзець па тэлебачанні — яго найлепш паказваць у кінатэатрах. А ў тэлебачання ёсць свае спецэфекты, музычнае афармленне. А форма маналогу... Нашы героі настолькі самадастатковыя, што ўсё важнае могуць распавесці і без закадравага тэксту! Трэці наш герой — майстар Ігар Бышнёў. Ён працуе ў Бярэзінскім біясферным запаведніку, з'яўляецца кандыдатам біялагічных навук. Але гэты чалавек ужо даўно сышоў у дакументалістыку, здымае фільмы пра прыроду. Нашы героі — беларусы, якія самааддана выбралі пэўны шлях і ідуць па ім, робячы ўсё шчыра і прыгожа, выконваючы сваю місію.

***— Пэўна, такі прыклад і гледачоў натхніць на тое, каб ісці сваёй дарогай. Можа, і вы асабіста на нешта натхніліся?***

— Больш даведваючыся пра героя, разумееш, што настолькі самааддана рабіць справу яны б не змаглі, калі б мелі нейкую іншую зацікаўленасць. Спажывецкія рэчы для іх на другім месцы. Усе гэтыя людзі аказаліся вельмі моцнымі асобамі, працаўнікамі, якія гатовы аддана служыць сваёй справе. Часам нават зайздросціш таму, наколькі вялікая ў іх цікавасць да жыцця і да свайго паклікання.

***— А ў вас асабіста на першым месцы тэлебачанне? Ці ёсць іншыя зацікаўленасці?***

— Я працую з мастацтвам. Цяпер на тэлеканале «Беларусь 24» мы робім праграму «АРТіШОК» — імкнемся знаходзіць нефармальныя праявы творчасці, звяртацца да цікавых, глыбокіх асоб, якія, можа быць, не надта раскручаны ў грамадстве.

***— Ваша мэта — знайсці і паказаць адметнасць?***

— Мне падаецца, так. Бо калі ты выбраў прафесію тэлежурналіста, трэба адшукваць цікавыя хады. Выходзіць па-за межы навіннага фармату, які робіцца на патрэбу дня. А такія цыклы, як наш, дазваляюць закрануць глыбокія тэмы, звярнуць увагу на штосьці. Я рада, што стала журналістам. Натуральна, кожны зыходзіць са сваіх здольнасцяў. Бо можна быць і бухгалтарам, але, калі гэта тваё, ты будзеш шчаслівы і будзеш адчуваць, што знаходзішся на сваім месцы. А ў мяне такі характар — заўсёды хацелася апынуцца там, дзе зачынены дзверы, пазнаёміцца ці даведацца больш за тое, што табе, умоўна, дазволена па прэйскуранце. Я рада, што атрымала магчымасць задаволіць сваю цікаўнасць у гэтым праекце.

***— Распавядзіце, якія плюсы і складанасці ў працы тэлевізіёншчыка?***

— Гэта камандная праца. Вынік залежыць ад многіх складнікаў. Трэба, каб герой апынуўся на месцы, каб у яго быў добры настрой. Каб побач не ішла будоўля, нічога не шумела і не грымела — інакш гук будзе з хібамі. Каб увагу героя нічога не адцягвала і каб ён знайшоў для нас час. Цяпер мы пераходзім на новую якасць, таму шмат залежыць ад тэхзабеспячэння. Заяўку на тэхніку трэба пакідаць за два тыдні — і яшчэ важна, каб у калег у гэты дзень не было здымак, ты павінен з імі падзяліць абсталяванне, падладзіцца пад расклад. Патрэбен добры апаратар, каб малюнак атрымліваўся прыгожы. Адпаведна, і на мантажы павінен быць рэжысёр, які заўважае ўсе нюансы. Гэта праца, у якой завязана вельмі шмат людзей, — складаны арганізацыйны працэс, аднак у нас ён ужо добра наладжаны. Як зоры павінны сысціся ў пэўны момант, так і ў працы тэлекаманды ўсё павінна ўдала падабрацца.

***— Не складана пастаянна ездзіць у камандзіроўкі?***

— Наша работа вельмі ўдзячная. Кожны раз ты быццам набываеш квіток у кіно. Едзеш у камандзіроўку — і там абавязкова будзе штосьці цікавае. Табе ўсё пакажуць, раскажуць. А пэўныя складанасці ёсць у любой справе. Самаадчуванне залежыць і ад таго, што атрымліваецца ў выніку. Калі гэта праект, які табе цікавы, то атрымліваеш задавальненне.

***— Ці выкарыстоўваеце новыя падыходы ў рабоце?***

— Так, цяпер тэлежурналістыка робіцца крыху іншай. Мы адыходзім ад штатыўных здымак, выкарыстоўваем рухомыя камеры, здымаем слайдарамі. І апаратар больш рухаецца, і герой выглядае інакш. А што датычна формы маналогу — мы таксама сталі больш свабодныя, больш сучасныя. Ніхто не спрабуе паўплываць на наша меркаванне. На ўзроўні мантажу мы можам скончыць на той думцы, якая патрэбна. Мантажом можна фарміраваць меркаванне і ўражанне пра героя.

***— Можна сказаць, што дзякуючы праграме вы па-новаму адкрылі для сябе Беларусь?***

— У мяне заўсёды было перакананне, што ў вёсцы ты адшукаеш вельмі цікавага суразмоўцу, і ў кожнага знойдзецца свая дзівосная гісторыя. У нашай праграме важна паказаць тых людзей, што не проста пражываюць жыццё, а робяць нешта важнае. Мы прадстаўляем Беларусь на ўвесь свет. Таму і паказваем усё ўнікальнае і непаўторнае для нашай краіны.



**Алесь ДУДАР адраджае старажытнае майстэрства.**

***— Калі чалавек з іншай краіны паглядзіць вашы перадачы, якімі ён убачыць беларусаў?***

— Памятаю, мяне ўразіў каментарый аднаго этнографа, што наведаў нашу краіну дзесьці ў XVIII—XIX стагоддзі. Тады беларусы былі зусім не тыя — несапсаваныя, глыбокія. А цяпер быццам штосьці змянілася, і мы маем іншае пакаленне. Аднак мне падаецца, што тыя, каго мы паказваем, — найлепшыя. Яны сапраўды набліжаныя да таго вобраза, па якім іх ствараў Бог. Яны выконваюць на зямлі вельмі прыгожую задуму. Нашы героі — лепшыя прадстаўнікі не толькі Беларусі, але і ўсяго свету.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

**Фота з асабістага архіва Алены НЕКРАШЭВІЧ**



**У майстэрні Андрэя МАРТЫНЮКА, які вырабляе гадзіннікі з дрэва.**

# Пашыраючы даляглады

**Шэрагі слухачоў міжнароднага радыё «Беларусь» папоўніліся: у гэтым сезоне станцыя пачала вяшчанне на дзявятай па ліку — арабскай — мове, а нядаўна атрымала зваротную сувязь з Туніса і Аргенціны.**

Нагадаем, на арабскай мове сёлета ўпершыню пачаў выходзіць грамадска-палітычны праект «Знаёмцеся: Беларусь!». Пра тое, што ў яго ўжо з'явілася свая аўдыторыя, сведчыць ліст ад Ауні Амара Харбіта з Туніса, які выказаў падзяку за такі радыёмост сяброўства, а таксама папрасіў агучваць у эфіры больш пісьмаў слухачоў з розных краін і шырэй выкарыстоўваць беларускую музыку.

Таксама ў межах акцыі «Гукае ласкай родны край» анлайн-прывітанне даслала слухачка з Аргенціны — Таццяна Самусенка, якая цяпер хоць і жыве ў рэгіянальнай сталіцы імігрантаў у Берыса, але захоўвае пяшчотныя ўспаміны пра сваіх беларускіх бабуль і дзядуль. «У 2014 годзе ў мяне з'явілася магчымасць лепш пазнаёміцца з Беларуссю — я ўдзельнічала ў мерапрыемстве, якое сабрала ў Мінску беларусаў з усяго свету, — успамінае слухачка, — а сёлета атрымалася прыехаць у Мінск падчас водпуску і ажыццявіць сваю даўнюю мару паездзіць па краіне маіх продкаў. І гэта было проста цудоўна!»

Нагадаем, іміджавая акцыя «Гукае ласкай родны край» праводзіць «пераклічку» ўсіх ахвотных, хто мае беларускія карані. Свае прывітанні і ўспаміны пра малую радзіму ўжо даслалі замежныя беларусы Расіі, Польшчы, Германіі, Грузіі, Італіі, ЗША, Грэцыі і Аўстраліі. Далучыцца да іх можна ў любой краіне свету, калі наведаць афіцыйны сайт міжнароднага радыё «Беларусь» radiobelarus.by і запоўніць адпаведную форму. Для самых актыўных і крэатыўных удзельнікаў падрыхтаваны адмысловыя сувеніры.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.** *tselyashuk@zviazda.by*

# ШАХМАТНЫ КЛУБ

**Выпуск №31**

На грэчаскім востраве Крыт адбыўся XXI камандны чэмпіянат Еўропы. У мужчын змагаліся 40 камандаў, Беларусь заняла 18-е месца. Наша каманда перамагла зборныя Бельгіі, Славеніі, Іспаніі і Аўстрыі, згуляла ўнічыю з Англіяй, прайграла Расіі, Польшчы, Нідэрландам і Ізраілю. На першай дошцы на рахунку Сяргея Жыгалкі — пройгрыш і сем нічыіх, на трэцяй дошцы Кірыл Ступак набраў 50% ачкоў (па два выйгрышы і пройгрышы, тры нічыі). Астатнія тры беларускія гросмайстры набралі больш за палову магчымых ачкоў: Уладзіслаў Кавалёў выйграў тры партыі пры двух пройгрышах і трох нічыіх; Аляксей Аляксандраў перамог у трох партыях пры адным пройгрышы і дзвюх нічыіх; Аляксей Фёдараў атрымаў тры перамогі пры адным паражэнні і трох нічыіх.

Жаночая зборная Беларусі фінішавала 20-й з 32. Яна перамагла шахматыстак Аўстрыі, Нідэрландаў і Славеніі, згуляла ўнічыю з Азербайджанам і Літвой, прайграла Грузіі, Іспаніі, Сербіі і Грэцыі. На першай дошцы гросмайстар Настасся Зязюлькіна выйграла чатыры партыі пры трох паражэннях і дзвюх нічыіх, на другой міжнародны майстар Вольга Бадэлька атрымала пяць перамог пры адным пройгрышы і трох нічыіх. Добра згуляла і Яна Ільючык: +4-2=1. Горшыя паказчыкі ў майстроў ФІДЭ Ланіты Сцяцко (+1-4=1) і Таццяны Рэвы (+1-4=0).

Вось дзве пераможныя партыі нашых суайчыннікаў.

Аляксей Фёдараў — Юры Скаберн (Славенія). 1.c4 Kf6 2.d4 g6 3.f3 Cg7 4.e4 d6 5.Ke2 0-0 6.Ce3 c6 7.Фd2 a6 8.Kbc3 b5 9.Ch6 Kbd7 10.h4 Kb6 11.Kg3 e5 12.C:g7 Kp:g7 13.h5 ed 14.Ф:d4 Ce6 15.0-0-0 C:c4 16.Ф:d6 C:f1 17.Лh:f1 Kc4 18.Kf5+ Kph8 19.Ф:c6 Фb6 20.Ф:b6 K:b6 21.hg fg 22.Kd6 Лa7 23.e5 Kh5 24.Ke2 Лc7+ 25.Kpb1 Лc5 26.f4 Kd5 27.Kb7 Лc7 28.Л:d5 Л:b7 29.g4 Kg7 30.f5 gf 31.gf Лbb8 32.f6 Ke6 33.Kf4 Лbe8 34.K:e6 Л:e6 35.Kpc2, 1:0.

Зейнаб Мамедзярава (Азербайджан) — Вольга Бадэлька. 1.d4 Kf6 2.Kf3 c5 3.e3 e6 4.Cd3 d5 5.b3 Kc6 6.Cb2 Cd6 7.Kbd2 0-0 8.0-0 b6 9.a3 Cb7 10.Ke5 Ke7 11.dc bc 12.c4 Фc7 13.f4 Kf5 14.Kg4 Ke4 15.C:e4 de 16.Kf6+ Kph8 17.Kf:e4 K:e3 18.Фh5 f6 19.Лf3 Kf5 20.Лh3 h6 21.Лe1 C:f4 22.Kf3 Лad8 23.Фg6 Kd4 24.C:d4 cd 25.Kh4 d3 26.Фg4 C:e4 27.Л:e4 Фc5+ 28.Kpf1 f5 29.Kg6+ Kpg8 30.Фh5 d2 31.Лe1 deФ+ 32.Kp:e1 Фg1+, 0:1.

* * *

Мінулы раз мы прапанавалі для рашэння тры двуххадоўкі з праграмы X Кубка «Альбіна». Сёння змяшчаем яшчэ адну «кубкавую» задачу ***(гл. дыяграму).***



Белыя: Kpb8, Фa3, Cc8, Cf8, Kg5, Kh8, пп. d3, e7 (8).

Чорныя: Kpe8, Фc3, Kg8, пп. b3, b6, c7, g7 (7).

Мат у 3 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Мікіта Маёраў заняў другое месца ў французскім Кап д'Агдзе (175 удзельнікаў), Сяргей Каспараў быў чацвёрты ў Берліне (183). На Кубку М. Бацвінніка ў Маскве Мацвей Папунідзі — восьмы сярод юнакоў, Арына Кузіч — пятая сярод дзяўчат. Прызавую тройку рэспубліканскай спартакіяды дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ склалі каманды з Магілёва, Брэста і Мінска. На міжнародным фестывалі «Чорная пешка» ў Брэсце ў дзіцячых турнірах першыя месцы занялі Каця Зубкоўская, Арцём Лапін і Максім Царук, у дарослым — Дзмітрый Буланаў, у бліцы — Аляксей Чэрапаў.

* * *

Рашэнне задач з мінулага выпуску: №1. 1.C:c4. №2. 1.C:c4. №3. 1.Лh6. Першым правільна адказаў Ігар Ананіч (Гродна).

**Вадзім ЖЫЛКО.**

## Пятніца, 1 снежня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 1.55** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15** Зона X (16+).
**9.10 Серыял «След». (16+).**
**10.55, 12.10, 18.40, 19.20 Серыял «Дзяжурны ўрач». (16+).**
**13.10** Дзіцячы доктар.
**13.40** Дзень у вялікім горадзе.
**14.40, 15.25, 17.05 Серыял «Райскае месца». (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**21.00** Панарама.
**21.50** Клуб рэдактараў. (16+).
**22.30 Меладрама «Казкі мачахі». (12+).**
**2.10** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 19.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.05 Серыял «Жаночы рай». (16+).**
**11.15** «Тата зможа?» (16+).
**12.10 Серыял «Каманда». (16+).**
**14.05, 19.25** «Амерыканскі жаніх». (16+).
**15.15 Серыял «Іх пераблыталі ў раддоме». (16+).**
**16.15, 0.10** Нічога сабе ньюз. (12+).
**16.20, 0.15** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**20.20** «Паненка-сялянка». (16+).
**21.30** «Багіня шопінгу». (16+).
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**22.05** «Бітва экстрасэнсаў. 16-ы сезон». (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.40, 12.20** «Беларуская кухня». Грыбкі.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 23.50** «Гэты дзень».
**8.25, 18.20 «Асобае падраздзяленне». Маст. фільм (12+).**
**9.30, 17.55** «Легенды кіно». Леанід Гайдай (12+).
**10.00** «Зямля, якая дае мне сілы». Дак. фільм (12+).
**10.25, 14.40 «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял (16+).**
**12.50** «Сіла веры».
**13.15** «Славянскі базар у Віцебску-2011».
**14.10** «Музеі Беларусі». Віцебскі абласны краязнаўчы музей. Віцебскі маст. музей.
**16.15, 21.05** «Бітва за Днепр. Невядомыя героі». Дак. фільм (12+).
**16.55, 21.45 «Далёка ад вайны». Маст. фільм, заключная серыя (16+).**
**19.25** «Тэатр у дэталях». Спектакль Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра «Юнона» і «Авось».
**20.10** «Беларуская кухня». Каша-прысыпанка.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.40** «Песні пад гітару».
**22.55** «Час кіно». Працы студэнтаў майстэрні народнага артыста Беларусі Віктара Турава і народнага артыста Беларусі Аляксандра Яфрэмава.

### Беларусь 5

**8.00** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Металург» (Жлобін) — «Нёман» (Гродна).
**9.55** Біятлон. Этап Кубка свету. Эстэрсунд. Індывідуальная гонка. Мужчыны.
**11.40, 14.00** Спорт-мікс.
**11.50** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 58 кг.
**13.30** Авертайм.
**14.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**15.10** Змешаныя адзінаборствы. UFC.
**17.15** На шляху да ЧС-2018. Відэачасопіс.
**17.50, 21.00** Спорт-цэнтр.
**18.00** Футбол. ЧС-2018. Жараб'ёўка групавога этапу.
**19.00** Фактар сілы.
**19.35** Біятлон. Этап Кубка свету. Эстэрсунд. Спрынт. Жанчыны.
**21.10** Сусветныя гульні баявых мастацтваў. Мінск-2017.
**22.20** Бокс. Бой за тытул чэмпіёна свету па версіі WBA. А. Усцінаў (Беларусь) — М. Чар (Германія).

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Ідэальны рамонт» (12+).
**10.00** «Жыць здарова!» (12+).
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.20, 13.10** «Геніі і ліхадзеі» (12+).
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20 Камедыя «Прыходзьце заўтра...» (12+).**
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Поле цудаў» (16+).
**20.00** Час.
**21.05** «Голас». Новы сезон (12+).
**23.00** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Зімовая серыя гульняў (16+).
**0.10** «Вячэрні Ургант» (16+).
**1.10** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 18.35** «Тайны Чапман» (16+).
**9.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**10.40 «Падкідны». Серыял. Заключныя серыі (16+).**
**12.30** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**13.50 Камедыя «Самалётам, цягнікам, аўтамабілем» (16+).**
**15.30** «Вадзіць па-руску» (16+).
**16.10** «Аўтапанарама» (12+).
**16.50** «Скардзіцца дазваляецца».
**17.10** «Адкрытая размова».
**17.35 «Пад прыкрыццём». Серыял. Заключная серыя (16+).**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Руская зброя будучыні: на моры, на сушы, у паветры» (16+).
**22.00** «Глядзець усім!» (16+).
**23.05** «Доказы Бога» (16+).
**0.00** Эніа Марыконэ: запіскі міру. Канцэрт у Венецыі (16+).

### МІР

**7.30** «Добрай раніцы, свет!» (16+).
**8.35, 23.00** «На ўвесь голас» (12+).
**9.45** «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
**10.20, 13.15 Серыял «Маша ў законе» (16+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**14.25** «Іншы свет» (12+).
**15.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
**17.10 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.20 Серыял «Мінус адзін» (16+).**
**0.20** «Трымайся, шоубіз!» (16+).
**0.50** «Кашмар вялікага горада» (16+).
**1.20 Маст. фільм «Банкаўскі білет у мільён фунтаў стэрлінгаў» (16+).**
**3.00 Маст. фільм «Небяспечныя гастролі» (12+).**
**4.45** М/ф (0+).

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
12.00, 22.10, 23.10 Серыял «Свая чужая». (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**20.35 Серыял «Марозава». (12+).**
**22.15, 23.10** «Гумарына». (16+).
**0.25 Маст. фільм «Трэцяя спроба». (16+).**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**7.50, 8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**9.40, 23.25** «НЗ.by».
**10.25, 19.40** Дзённікі «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**10.30 Серыял «Падазраюцца ўсе». (16+).**
**11.05 Серыял «Сведкі». (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных». (16+).
**13.30, 18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05** «Месца сустрэчы».
**16.35 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў». (16+).**
**19.45 Серыял «Мянтоўскія войны». (16+).**
**23.55 Серыял «Агенцтва схаваных камер». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.45, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.15, 16.00** Для дзяцей: «Адказвайка».
**7.30** «Раніца на восьмым».
**10.30** «Дзецям пра зверанят».
**11.00 Дэтэктыў «Небяспечныя тайны» (18+).**
**13.00 Серыял «Жорсткае каханне».**
**14.25 Серыял «Прыгоды маладога Індыяны Джонс» (12+).**
**16.05** «Мультпарад»: «Страла ляціць у казку».
**16.30** «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**17.00 Серыял «Дарагі доктар».**
**18.25 Серыял «Маленькая хлусня» (16+).**
**20.00 Серыял «Свой сярод чужых» (16+).**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Шпіёнскі мост» (16+).**
**23.30** М/ф.

### ВТБ

**6.00, 15.15** Серыял «Вароніны». (12+).
**7.20** «Дурні і дарогі». (16+).
**7.40, 4.20** М/ф «Дуда і Дада». (0+)
**8.00, 4.30** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.20, 4.50** М/ф «Аліса ведае, што рабіць!» (6+)
**8.50, 3.50** «Ералаш». (6+)
**9.30** Серыял «Сямейны бізнес». (12+).
**10.40** Камедыя «Тэрмінал». (12+).
**13.00, 19.00** Серыял «Псіхалагіні» (16+).
**14.10, 20.10** Серыял «Гатэль «Элеон». (16+).
**16.45, 5.10** Серыял «Ранеткі». (12+).
**17.50** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.20** Фантастыка «Вайна светаў». (12+).
**23.40** Жахі «Упусці мяне. Сага». (16+).
**1.50** Серыял «Закрытая школа». (16+).
**3.30** «Лаві момант». (16+).

### Культура

**6.30** «Хітрыкі памяці». Дак. фільм.
**7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**7.35** «Легенды сусветнага кіно». Мікалай Рыбнікаў.
**8.05** «Расія, любоў мая!» «Белы месяц буратаў».
**8.35** «Астравы». Эдуард Арцем'еў.
**9.15** «Мабільны для Лубянкі». Дак. фільм.
**9.40** Галоўная роля.
**10.20** Шэдэўры старога кіно. «Чалавек №217». Маст. фільм.
**12.15** «Гісторыя пра тое, як Павел Траццякоў збіраў сучаснае мастацтва».
**13.15** «Аўстрыя. Зальцбург. Палац Альтэнау». Дак. фільм.
**13.45** «Вандроўны энтузіяст Мсціслаў Дабужынскі». Дак. фільм.
**14.30** «Бляск і горкія слёзы расійскіх імператрыц». Дак. серыял.
**15.10** Фестываль Вальдбюнэ. Сэр Сайман Рэтл і Берлінскі філарманічны аркестр.
**15.45** Колер часу. Сандра Батычэлі.
**16.00** «Пісьмы з правінцыі». Карачаева-Чаркесія.
**16.30** «Царская ложа».
**17.10** Геніі і ліхадзеі. Мікалай Кастамараў.
**17.40** Вялікая опера — 2017.
**18.45** 80 гадоў Навуму Клейману. «Астравы».
**19.45** Усерасійскі адкрыты тэлевізійны конкурс юных талентаў «Сіняя птушка».
**21.50** «Шукальнікі». «Падводны скарб Балаклавы».
**22.35** «Лінія жыцця». Юрый Вяземскі.
**23.45** «2 Вернік 2».
**0.30** Маэстра Раймалд Паўлс і біг-бэнд Латвійскага радыё.
**1.35** «Шукальнікі». «Апошні прытулак апостала».
**2.25** «Аркадзія». «Доўгі мост у патрэбны бок». «Прылівы тудысюды». М/ф для дарослых.

### Настальгія

**6.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
**7.05** Маст. фільм «Кантрабанда» (16+).
**8.25, 9.40, 11.00, 11.40, 12.50, 14.25, 15.40, 17.00, 17.40, 18.50, 20.40, 21.40, 23.00, 1.00, 2.35, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.30** «Сядзі і глядзі» (16+).
**12.00** «Эліта Краіны Саветаў». Алег Анофрыеў. 2007 год (12+).
**13.00** Маст. фільм «Жыццё і дзіўныя прыгоды Рабінзона Круза» (16+).
**18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1964. 1-я частка. 2011 год (16+).
**19.30** Маст. фільм «Агледзіны» (16+).
**22.00** «Колба часу» (16+).
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Азартныя гульні ў СССР». 2007 год (16+).
**1.20** Маст. фільм «Пчолка» (18+).

### EuroSport 1

**3.30, 5.00, 8.00, 14.30, 18.30** Біятлон. Кубак свету.
**4.30, 7.30, 18.00** Скачкі з трampліна. «Нерасказаная гісторыя». Каміль Стох.
**7.00** Лыжнае дваябор'е. Кубак свету.
**10.30, 1.35** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**11.00, 2.30** Футбол. Чэмпіянат MLS. Фінал Канферэнцыі.
**12.30** Дрон-рэйсінг. DR1 Champions.
**13.30, 16.45, 18.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**21.00** Горныя лыжы. Кубак свету.
**0.00** Конны спорт. Longlines Masters.

### Кінакамедыя

**0.30** Камедыя «Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі». (12+).
**2.35** Камедыя «Чаго хочуць жанчыны?» (16+).
**5.00** Меладрама «Сведка на вяселлі». (16+).
**7.00** М/ф «Урфін Джус і яго драўляныя салдаты». (0+).
**8.45** Камедыя «Ас». (16+).
**10.35** Камедыя «Кароль вечарынак». (16+).
**12.20** Меладрама «Сексаголік». (16+).
**14.00** Камедыя «Бамбу». (16+).
**15.55** Камедыя «Дзюплекс». (12+).
**17.35** Камедыя «Аксамітныя ручкі». (16+).
**19.30** Камедыя «Уцекачы». (12+).
**21.10** Меладрама «Безразважна закаханы». (16+).
**23.05** Камедыя «Аперацыя «Тушонка». (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.00** «Доктар I...» (16+).
**8.30** «Трэндзі» (16+).
**09.00** «Кузей. Гюней». Серыял (16+).
**10.35, 3.40** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.10** «Сляпая» (12+).
**13.10** «Варажбітка» (12+).
**14.15, 5.10** «Паралельны свет» (12+).
**15.10** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**15.45** «Здзелка» (16+).
**16.15, 2.50** «Шурачка» (16+).
**17.10** «13 знакаў Задыяка» (12+).
**18.10, 2.00** «Бітва рэстаранаў» (16+).
**19.10, 1.10** «Гучныя справы» (16+).
**20.10** «Мы купілі заапарк». Камедыя (16+).
**22.20** «Савецкія мафіі» (16+).
**23.10** «Пляж». Трылер (16+).

### ТБ1000

**6.10, 16.10** Яна яго абажае (16+).
**8.10** Поўнымі грудзьмі (16+).
**10.10** Помні (Memento) (16+).
**12.20** Каханне і сяброўства (12+).
**14.10** Мой хлопчык (12+).
**18.10** Пазаземнае рэха (12+).
**20.10** Назад у будучыню I (6+).
**22.25** Апантанасць (16+).
**0.30** Іншыя (16+).
**2.30** Я ўсё яшчэ ведаю, што вы зрабілі мінулым летам (16+).
**4.15** Кастрычніцкае неба (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Перакладчык. 2-я серыя (12+).
**8.20** Каўказскае трыа (12+).
**10.05** Буду помніць (16+).
**12.05** Пастка для адзінокага мужчыны (16+).
**13.55** Мужчына ў маёй галаве (16+).
**16.20, 4.20** Жанчына з лілеямі. 1—2-я серыі (16+).
**18.10** Вязень старой сядзібы (12+).
**20.20** Выкрутасы (12+).
**22.20** Палюбоўнік (16+).
**0.25** Практыкаванні ў цудоўным (16+).
**2.25** Вясёлая моладзь (12+).

### National Geographic

**6.00** Узлом Сістэмы. (16+).
**6.25** Зрабі або памры. (12+).
**6.50** Займальная навука. (12+).
**7.35, 5.30** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**8.05, 10.20** Мегазаводы. (12+).
**8.50, 11.10** Шаша праз пекла. (12+).
**9.35** Служба бяспекі аэрапорта. (16+).
**11.55, 17.10, 20.20** Аўта-SOS. (12+).
**12.40** Навука будучыні. (12+).
**13.25** Гульні розуму. (12+).
**15.00** Даследчык 2.0. (12+).
**15.45** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха. (12+).
**18.00, 21.05, 0.55, 4.00** Панарама 360. Аб'ект сусветнай спадчыны. (12+).
**18.45, 22.35** Пачатак. (12+).
**19.35, 0.10, 2.30** Расследаванні авіякатастроф. (12+).
**21.50, 1.40, 4.45 80**-я. Найвялікшыя спартсмены (12+).
**23.25** Другая сусветная вайна: пекла пад вадой. (16+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 2.55, 4.40** Махінатары. (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 2.25, 6.20** Як гэта ўстроена? (12+).
**10.00, 16.00, 1.00** Сапёры. (16+).
**10.30, 16.30, 23.00, 3.50** Склады: бітва ў Канадзе. (12+).
**11.00** Мяцежны гараж. (16+).
**14.00, 7.10** Голыя і напалоханыя. (16+).
**18.00, 5.30** Хуткія і гучныя. (16+).
**19.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**20.00** Космас. Пачатак. Будучыня. (12+).
**0.00** Як уладкаваны Сусвет. (12+).
**1.30** Самагоншчыкі. (18+).

# сталіца трымаецца



***— Не магу не спытаць: апошнія дзесяцігоддзі былі нярпростымі, як удалося захаваць рост аб'ёмаў вытворчасці?***

— У асноўным за кошт мадэрнізацыі магутнасцяў, закупкі і мантажу ва ўласныя сродкі больш прадукцыйнага абсталявання, інтэнсіфікацыі і нават аптымізацыі вытворчасці, як ні трывіяльна гучыць. А самае галоўнае — за кошт нашага чалавечага патэнцыялу. На прадпрыемстве працуе 279 чалавек, гэта сапраўдныя прафесіяналы сваёй справы. Цікавы факт: сярэдняя працягласць работы на прадпрыемстве павялічылася з 10 да 17 гадоў. А ўзровень адукацыі намнога вышэйшы, чым некалькі гадоў назад: павялічылася колькасць работнікаў, якія маюць некалькі дыпломаў аб вышэйшай адукацыі.

Важна, што нашы спецыялісты заўсёды ў курсе навінак горназдабываючай галіны, яны назапашваюць веды, дзеляцца вопытам, актыўна ўдзельнічаюць у навуковых канферэнцыях, падтрымліваюць цесныя сувязі з навукоўцамі.

***— З чым вы звязваеце перспектывы свайго калектыву?***

— З выдзяленнем новых зямельных участкаў пад распрацоўку, з пошукам і асваеннем новых перспектыўных радовішчаў. У планах урада на 2017 год — рост будаўніча-мантажных работ у Мінску і вобласці і ўзвядзення жылля. Таму крайне неабходнае выдзяленне дадатковых кар'ераў для забеспячэння будаўнічага комплексу няруднымі матэрыяламі.



Звязваем сваю будучыню таксама з укараненнем новых відаў дзейнасці і новай наменклатуры прадукцыі. Увогуле з эфектыўнай работай калектыву, якая з'яўляецца асновай нашага дабрабыту. Мы спраўляемся з даведзенымі нам прагнознымі паказчыкамі сацыяльна-эканамічнага развіцця, пра што сведчаць вынікі работы за 9 месяцаў. Што яшчэ важна — нягледзячы на пэўныя эканамічныя складанасці, ААТ «Нярудпрам» па сваіх абавязацельствах заўсёды разлічваецца ўласнымі сродкамі, не карыстаецца крэдытамі банкаў і іншай фінансавай падтрымкай, не мае запазычанасці па зарплаце, падатках і іншых абавязковых плацяжах, а таксама перад контрагентамі. На сённяшні дзень ААТ не толькі не дапусціла істотнага падзення асноўных паказчыкаў работы, але частку з іх нават нарасціла. Што сведчыць аб устойлівым фінансава-эканамічным становішчы прадпрыемства і дазваляе працоўнаму калектыву з аптымізмам глядзець у будучыню.

ААТ «Нярудпрам» прайшло вялікі і годны шлях. Шчыра віншую ўсіх членаў калектыву з 70-годдзем прадпрыемства і з тым, што мы сустракаем гэтую цудоўную дату неблагімі вынікамі. Што нас ведаюць і паважаюць, ліва ставяцца да нас на будаўнічым рынку сталіцы і краіны ў цэлым. Сёння мы — адна сям'я, здольная вырашаць складаныя вытворчыя задачы і ісці далей, у імя росквіту краіны. Жадаю кожнаму знайсці сваё месца ў агульным страі, дзе ён найлепшым чынам змог бы рэалізаваць уласныя магчымасці і навыкі. Маладым — хутчэй упісацца ў штодзённы напружаны рытм. Людзям сярэдніх гадоў — не разгубіць стваральны настрой, шукаць новае, дзяліцца досведам з навічкамі. Асаблівая наша падзяка — ветэранам вытворчасці, якія заўсёды былі стрыжнем калектыву, і наша пажаданне ім далейшага аптымізму і плёну. Усім — моцнага здароўя, міру, дабрабыту і ўзаемаразумення ў сем'ях, што пры спецыфіцы нашай працы таксама важна.

**Гутарыў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**

**Здымкі прадстаўлены прадпрыемствам.**

УНП 100016844

## «ГАРАНТУЕМ ЯКАСЦЬ І ДАСТУПНУЮ ЦАНУ»

Яшчэ адзін наш суразмоўца — намеснік дырэктара **Мікалай ВІЛЬКОТ**.

***— У Мінскім раёне не менш за 50 кар'ераў розных гаспадароў. У «Нярудпрама» толькі два, але да 75—80% прадукцыі з зямель раёна дае менавіта «Нярудпрам». Чаму такое паломніцтва на вашы заводы?***

— Галоўнае — мы гарантуем якасць. Прадукцыя адпавядае самым высокім патрабаванням, сертыфікаваная, маем пасведчанні. Ёсць адпаведная служба і спецыялісты па якасці на кожным нашым заводзе. Якасць прадукцыі правяраецца рэгулярна і з удзелам спажыўцоў.

І яшчэ: наша цана на прадукцыю не ў поўнай меры падвержана хістанням рынку, дастаткова стабільная і кантралюецца органамі дзяржаўнага кіравання.

Прызначаны ў канцы 2015 года генеральным дырэктарам Аляксандр Лойка падабраў каманду, якая стала ядром калектыву, згрупавала яго вакол сябе. Давялося замяніць некалькіх кіраўнікоў структурных падраздзяленняў, падняць вытворчую і тэхналагічную дысцыпліну. Адмовіліся ад таго, што было ў мінулым накоплена негатыўнага, што замінала працаваць, і выйшлі на прыбытковую работу. Прыбытак пакуль невялікі, але ён ёсць, і тэндэнцыя станоўчая. Бізнесплан на гэты год быў заяўлены даволі аптымістычны, і думаю, што мы выйдзем на яго параметры, у тым ліку і па сярэдняй зарплаце. У нас жывыя традыцыі старэйшых пакаленняў калектыву. Мы ведаем, што дзякуючы ў тым ліку і нашаму прадпрыемству да 1955 года Мінск быў практычна адбудаваны і зараз з'яўляецца адным з найпрыгажэйшых гарадоў свету, — палічыў патрэбным падкрэсліць Мікалай Мікалаевіч.

На сённяшні дзень па нашых прыблізных падліках тых двух кар'ераў, якія мы маем, павінна хапіць на чатыры гады работы па забеспячэнні будаўніцтва ў сталіцы і вобласці. На бліжэйшы час прагназуецца рост тэмпаў у будаўнічай галіне аж на трыццаць працэнтаў. Значыць, спатрэбяцца дадатковыя тысячы і тысячы кубаметраў нярудных будаўнічых матэрыялаў нашым традыцыйным спажыўцам — «Мінскжалезабетону», «МАПІДу», будаўнічым трэстам «Мінскбуда» — іх каля дзясятка, і іншым прадпрыемствам будаўнічай і дарожнай галіны. А прыватныя будаўнічыя фірмы і прадпрыемствы, такія вядомыя, як група кампаній «Дана Холдынг» альбо «Тапас плюс»? Прыватнікам давядзецца асвойваць велізарныя аб'ёмы работ на плошчах таго ж старога аэрапорта. Не варта забываць і пра патрэбы звычайных грамадзян.

Мы пачынаем працаваць у палове восьмай, а ўжо ў пяць гадзін раніцы выстройваецца чарга па нашу прадукцыю. Да пачатку работы ў гэту чаргу становяцца 50—60 грузавікоў. Не паспяваем забяспечваць сваіх спажыўцоў. Калі б былі выдзелены большы ўчастак для распрацоўкі і здабычы, такіх чэргаў не было б.

Так, мы разумеем, што зямля — гэта здабытак народа, ад яе стану залежыць харчовая бяспека, адносін яна патрабуе да сябе ашчадных, у тым ліку і з пункту гледжання экалогіі. Лясы — лёгкія планеты, таксама падтрымліваем. Але ж нельга стрымліваць і грамадскі прагрэс, развіццё эканомікі, не выдзяляючы ў дастатковай колькасці тэрыторыі пад распрацоўку і здабычу будаўнічых нярудных матэрыялаў. Патрэбна шукаць і знаходзіць разумны баланс. Тым больш што мы вяртаем зямлю яе ранейшым карыстальнікам не толькі ў тым выглядзе, у якім атрымалі, а ў палепшаным стане. У прыватнасці, толькі за тры апошнія гады рэкультывавалі (аднавілі) больш за 180 гектараў на месцы выпрацаваных кар'ераў.

## ШТРЫХІ З ЖЫЦЦЯ КАЛЕКТЫВУ

✓ Прыкладна 2 мільёны кубоў будаўнічых матэрыялаў у год за сем дзясяткаў гадоў працоўнай біяграфіі калектыву вырастаюць у сапраўды касмічныя 140 мільёнаў кубоў!

✓ З улікам таго, што зараз у ААТ 279 працуючых, а было і па 600, у тым ліку ў замежных прадстаўніцтвах, то за 70 гадоў школу «Нярудпрама» па самых прыблізных падліках прайшлі не менш пяці тысяч. «А калі паглядзець, хто ў нас пясочак браў, то гэта практычна ўвесь Мінск», — гавораць на прадпрыемстве.

✓ Калектыў аказаў брацкую дапамогу народу Арменіі пасля разбуральнага землятрусу ў 1989 годзе. З гэтай мэтай быў створаны кар'ер «Ехегнуцкі». А на ўласным кар'еры «Джам» ва Узбекістане вялася здабыча мармуру для Мінскага метрапалітэна. Пазней абодва кар'еры былі перададзены Арменіі і Узбекістану.

✓ Кіпіць мнагагранная грамадскае жыццё, у цэнтры якога прафкам і пярвічка БРСМ. Традыцыйнымі сталі спартыўныя спаборніцтвы — у тым ліку ўдзел у штогадовых алімпіядах калектываў Кастрычніцкага раёна Мінска, а яшчэ — экскурсіі, культпаходы, мерапрыемствы па аздараўленні, дапамога са сродкаў прафсаюза на лячэнне і выдзяленне сродкаў на харчаванне пры шматзменным графіку работы.



# КРЭАТЫЎ ПЛЮС ЖЫЦЦЁВЫЯ СІЛЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

15 гадоў назад і Беларусь (адна з першых на прасторах СНД) адкрыла ў структуры Нацыянальнай акадэміі навук навучальную ўстанову новага тыпу — Інстытут падрыхтоўкі навуковых кадраў. Тут ёсць толькі магістарская і аспіранцкая ступені. Як растлумачыў Ігар Ганчаронак, для навучання ў магістратуры і аспірантуры гэтай установы эліту адбіраюць з усёй краіны — з выпускнікоў першай і другой ступеняў усіх ВНУ. Па назіраннях, для таго, каб выхаваць 50 вучоных (фізікаў ці матэматыкаў), на першы курс на адпаведныя спецыяльнасці трэба набраць 2,5 тысячы чалавек, што абсалютна немагчыма зрабіць у сценах адной ці нават некалькіх ВНУ.

Навучанне ў магістратуры Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў ажыццяўляецца па 136 спецыяльнасцях, на палове з якіх выкладанне і навуковае суправаджэнне могуць весціся на англійскай мове. Таксама тут ужо рыхтуюцца да адкрыцця магістарскіх праграм па адытыўных тэхналогіях (3D-друк) і электроннай сістэме аховы здароўя.

## АД МІНІМУМУ — ДА МАКСІМУМУ

**Старшыня Савета маладых навукоўцаў Нацыянальнай акадэміі навук Андрэй ІВАНЕЦ** паведаміў, што ў акадэміі працуе каля 2,2—2,3 тысячы маладых навукоўцаў. Гэта прыкладна чвэрць ад агульнай колькасці навуковых работнікаў НАН. Штогод каля 100 кандыдатаў навук абараняюць свае кандыдацкія дысертацыі, вялікая частка з іх — ва ўзросце да 35 гадоў.

На думку старшыні Савета маладых навукоўцаў, праблема з уцечкай навуковых кадраў за мяжу з Беларусі сёння стаіць не так востра, як гэта было 10—15 гадоў таму.

— Мы жывём у адкрытым свеце, і двухбаковая міграцыя, у тым ліку маладых навукоўцаў, з'яўляецца неад'емнай часткай і залогам паспяховага развіцця навукі. Да гэтага трэба ставіцца пазітыўна. Калі ёсць магчымасць у нашых маладых навукоўцаў папрацаваць за мяжой у суперсучасных навуковых цэнтрах на сучасным абсталяванні, паўдзельнічаць у міжнародных праектах, набрацца вопыту, а пасля вярнуцца на радзіму, то гэта толькі плюс, — адзначыў ён. — Што датычыцца заработнай платы, то мінімальны заробак у малодшага навуковага супрацоўніка без усялякіх надбавак складае каля 250 рублёў. Максімальна можна атрымаць да 2—3 тысяч беларускіх рублёў. Сярод маладых навукоўцаў такія прыклады ёсць. Каб зарабляць больш, маладыя вучоныя павінны больш актыўна ўдзельнічаць у міжнародных праектах...

Прадстаўнік Нацыянальнай акадэміі навук таксама адзначыў, што жыллёвае пытанне ў акадэміі вырашаецца досыць паспяхова. «Сёння сярод аспірантаў у нас няма тых, хто мае патрэбу ў жыллі — усе яны забяспечаны месцамі ў інтэрнатах. У кандыдатаў навук, якія стварылі ўласныя сем'і, ёсць магчымасць засяліцца ў інтэрнат сямейнага тыпу — гэта практычна свае кватэры. Істотную ролю ў вырашэнні пытання адыграла і будаўніцтва арэнднага жылля, у прыватнасці жылога комплексу «Магістр», — дадаў ён.

## ПАРТРЭТ ДОКТАРА НАВУК

А вось з чым праблемы пакуль ёсць, дык гэта з падрыхтоўкай дактароў навук, якія потым будуць рыхтаваць кандыдатаў навук. Натуральна, што без дактароў навук не будзе і кандыдатаў...

— Я ў 1997 годзе стаў доктарам навук у 35 гадоў, а Андрэй Іванец — старшыня Савета маладых вучоных — абараніў сваю доктарскую ў 33 гады, таму ёсць сярод дактароў навук і маладыя, — пажартаваў Ігар Ганчаронак і дадаў, што амаладжэнне кадраў — гэта прынцыповае пытанне, бо навуку рухаюць наперад усё ж маладыя, з іх крэатыўным мысленнем і жыццёвымі сіламі.

«Калі ў аспірантуру і так па азначэнні ідуць маладыя людзі, то для прыходу



маладых у дактарантуру трэба рабіць пэўныя захады. Мы зараз матывуем і настройваем кіраўнікоў навуковых установаў на тое, каб яны стваралі для сваіх маладых супрацоўнікаў умовы для навучання ў дактарантуры. І суадносіны маладых і сталых людзей, якія ідуць у дактарантуру, паступова змяняюцца. Цяпер сярод дактарантаў, якія навучаюцца ў нас і рыхтуюць свае доктарскія да абароны, маладых людзей ва ўзросце да 29 гадоў каля двух працэнтаў, а ва ўзросце да 39 гадоў — больш за трацiну, — канстатаваў ён.

А якая сітуацыя назіраецца ўвогуле па краіне? **Загадчык аддзела планавання і прагназавання падрыхтоўкі навуковых работнікаў найвышэйшай кваліфікацыі БелІСА Анатоль СУТУРЫН** прывёў наступную статыстыку: сярод тых, хто навучаецца зараз у дактарантуры, маладыя людзі ва ўзросце да 29 гадоў складаюць 0,7 працэнта, ва ўзросце ад 30 да 34 гадоў — 10 працэнтаў, 35—39 гадоў — 19,4 працэнта, 40—49 гадоў — 45,8 працэнта, 50 гадоў і старэйшыя — 24,8 працэнта. Сярэдні ўзрост дактарантаў складае 44 гады. Самы нізкі сярэдні ўзрост тых, хто навучаецца ў дактарантуры (36,7 года), зафіксаваны ў галіне медыцынскіх навук.

— Абараніць у навуцы доктарскую дысертацыю — не поле перайсці. У мяне, напрыклад, на гэта пайшло 12 гадоў. Вядома, у розных галінах навукі сітуацыя розная. Дзесьці, як у той жа сферы інфармацыйных тэхналогій ці медыцыне, усё развіваецца вельмі імкліва. Але ёсць галіны, дзе ад саіскальніка доктарскай ступені патрабуецца багаты прафесійны і жыццёвы досвед, напрыклад у педагогіцы, гісторыі, археалогіі... Для асэнсавання вынікаў часта патрабуецца час, — разважае **прарэктар па навуковай рабоце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Анатоль САФОНАЎ.** — Безумоўна, хацелася б, каб розніца паміж абароненым кандыдатам і доктарам навук была больш істотная, я маю на ўвазе статус доктара навук, прэстыжнасць працы, яго заробак. Маладыя людзі хочуць мець усё, прычым неадкладна...

**Праблема з уцечкай навуковых кадраў за мяжу з Беларусі сёння не стаіць так востра, як гэта было 10—15 гадоў таму.**

Як вядома, у ідэале кожны выпускнік аспірантуры павінен выйсці на абарону кандыдацкай або да заканчэння сваёй вучобы, або ў першы год пасля выпуску. Але так адбываецца далёка не заўсёды. І прычын на гэта шмат.

Увогуле, для таго, каб ісці ў аспірантуру і дактарантуру, павінен быць сфармаваны навуковы зачын. Калі ісці туды «пустым», то за тры гады вучобы нічога ў навуцы здзейсніць дакладна не атрымаецца. Павінна быць стратэгія, упэўненасць у тым, што выканаеш навуковае даследаванне, напішаш дысертацыю, абаронішся... Аспірантура прызначана толькі для тых, каму ёсць куды рухацца, і гэта трэба даводзіць да моладзі. Аднаначна пры такім падыходзе і ў аспірантуру, і ў дактарантуру прыйдзе менш людзей, але эфектыўнасць на выхадзе павысіцца. Вучоны — гэта «штучны тавар». Як не з кожнага можна выхаваць алімпійскага чэмпіёна, так і не кожнаму суджана стаць вучоным і здзейсніць прарыў...

У БДУ звяртаюць увагу на наступную акалічнасць: раней студэнты пасля трэцяга курса маглі залічвацца стажорамі малодшых навуковых супрацоўнікаў. Але цяпер амаль усе спецыяльнасці перайшлі на чатырохгадовы тэрмін навучання. У Белдзяржуніверсітэце, дзе, дарэчы, рыхтуецца кожны пяты аспірант у краіне, лічаць, што маладым людзям, якія сталі вельмі прагматычнымі, трэба дазволіць быць стажорамі ўжо пасля першага ці нават на першым курсе, каб яны маглі вучыцца і паралельна зарабляць на навуцы грошы.

Агульнавядома, што мала хто з навучэнцаў дзённай формы аспірантуры і дактарантуры сёння жыве за стыпендыю, усе яны або займаюцца выкладаннем, або рэалізуюць сябе ў іншых сферах. І вось тут паўстае ўжо іншая праблема: дзе знайсці час для таго, каб працаваць яшчэ і над сваёй будучай кандыдацкай ці доктарскай работай? Да таго ж зусім няпроста прайсці даволі складаную шматступеньчатую працэдуру па абароне дысертацыі з захаваннем усіх бюракратычных патрабаванняў... А калі першая спроба абароны аказваецца няўдалай, вельмі цяжка бывае адважыцца на паўторны штурм.

## КУРСЫ ДЛЯ НАВАБРАНЦАЎ

Андрэй Іванец паведаміў, што ў маі 2018 года ў Нацыянальнай акадэміі навук пройдзе другі курс школы маладога вучонага «Вучоны пад ключ». Удзел у першым прынялі каля 70 маладых навукоўцаў, палова з іх — з Акадэміі навук.

Ён адзначыў, што мэта школы маладога вучонага — павышэнне матывацыі: «Мы пастараліся літаральна за тыдзень правесці свайго роду курс маладога байца для чалавека, які толькі прыйшоў у навуку. Расказалі, як уладкаваная навуковая сфера ў Беларусі, як праца фінансаванне, якія створаны ўмовы для таго, каб паспяхова выбудаваць сваю навуковую кар'еру, праінфармавалі пра магчымасці грантавай падтрымкі праектаў. Акрамя таго, нашы старэйшыя калегі падзяліліся вопытам, як падрыхтаваць публікацыю высокага ўзроўню для высакарэйтынгавых замежных часопісаў, як укараніць сваю распрацоўку, як падрыхтаваць дысертацыйнае даследаванне. У перспектыве праект «Вучоны пад ключ» стане пастаянным».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

**У 2018 годзе плануецца стварэнне Адзінага рэестра тэм кваліфікацыйных навуковых работ (дысертацый), што выконваюцца ва ўстановах адукацыі і арганізацыях, якія рэалізуюць праграмы паслявузаўскай адукацыі. Стварэнне адзінага рэестра дазволіць не дапускаць паўтарэння тэм дысертацый, а таксама выключыць выпадкі выкарыстання аднатыпных тэм у розных установах паслявузаўскай адукацыі. Пры гэтым асаблівая ўвага будзе ўдзяляцца тэматыцы перспектыўных дысертацыйных даследаванняў, накіраваных на развіццё высокатэхналагічных вытворчасцяў, якія адносяцца да V і VI тэхналагічных укладаў эканомікі, перш за ўсё ў галіне нанатэхналогій, біятэхналогій, касмічных тэхналогій, медыцынскай хіміі і атамнай прамысловасці.**

## ■ Факт

### ДЗЕЛЯ ПАЎНАВАРТАСНАГА АБЕДУ

**Грашовыя нормы выдаткаў на харчаванне навучэнцаў установаў агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, спецыяльнай адукацыі і выхаванцаў установаў дашкольнай адукацыі павялічваюцца на 10 працэнтаў. Адпаведнае рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22 лістапада 2017 года №879.**

Гэта павелічэнне было здзейснена з мэтай забяспечыць дзецям і падлеткам рацыянальнае і збалансаванае харчаванне, а таксама ў сувязі з ростам індэкса спажывецкіх цэн на прадукты харчавання.

Паколькі бацькі выхаванцаў дашкольных установаў аплачваюць 100 працэнтаў кошту харчавання, для іх выдаткі на гэты артыкул таксама вырастуць на 10%.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### ЧАЧЭНСКАЕ АДРАДЖЭННЕ З БЕЛАРУСКІМ ПАЭТЫЧНЫМ ХАРАКТАРАМ

**У Грозным выйшаў першы — пасля некаторага перапынку — нумар літаратурна-мастацкага часопіса «Гоч». Фактычна — чачэнскі варыянт папулярнага маскоўскага часопіса «Иностранная литература» ці ўкраінскага «Всесвит», выданняў, аддадзеных пад публікацыю перакладных твораў.**

У першым нумары ўзноўленага выдання ёсць і беларускі раздзел. У ім змешчаны пераклады вершаў народных паэтаў Беларусі — Аркадзя Куляшова і Рыгора Барадуліна, а таксама нашых сучаснікаў — Навума Гальпяровіча, Віктара Шніпа, Юліі Алейчанкі. Перакладчык — Адам Ахматукаеў, які не ўпершыню звяртаецца да пераўвасаблення беларускай паэзіі. Раней перакладзеныя ім падборкі вершаў беларускіх паэтаў выходзілі ў чачэнскіх часопісах «Орга» і «Вайнах».

**Сяргей ШЫЧКО** ■


**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона без условий по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Белшина»**

Лот №1. **Изолированное помещение с инв. №730/D-7335. Помещение для торговли обувью,** площадью 84,9 кв. м, расположено по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Трудовая, 10А. Стены и перегородки – кирпичные, перекрытие – ж/бетонное, крыша – асбестоцементные волнистые листы.
Сведения о земельном участке: помещение расположено на земельном участке с кадастровым номером 724050100001005437 (право аренды), площадью – 0,0161 га, назначение: земельный участок для обслуживания здания магазина, расположен по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Трудовая, 10А.

***Начальная цена продажи: 8 516,06 белорусских руб. с учетом НДС; сумма задатка – 851,61 бел. руб.***

Лот №2. **Капитальное строение с инв. №730/С-12820. Здание заводоуправления,** площадью 2 935,2 кв. м, расположено по адресу: Могилевская обл, Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Трудовая, 1А. Фундамент – бутовый, стены – панельные, перегородки – панельные, кирпичные, перекрытие – ж/бетонное, крыша – совмещенная, рулонная.
Сведения о земельном участке: здание расположено на земельном участке с кадастровым номером 724050100001006644 (право аренды), площадью – 1,0277 га, назначение: земельный участок для обслуживания здания заводоуправления, расположен по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Трудовая, 1А.
**Капитальное строение с инв. №730/С-17060. Участок канализации от здания заводоуправления** до колодца №48 «Производство резиновых изделий, город Кричев ОАО «Белшина» по ул. Трудовой, 1 в г. Кричеве», протяженность – 97,8 кв. м.
**Капитальное строение с инв. №730/С-17061. Ввод водопровода в здание заводоуправления** от колодца №6 «Производство резиновых изделий, город Кричев ОАО «Белшина» по ул. Трудовой, 1 в г. Кричеве», протяженность – 9,7 кв. м.
**Капитальное строение с инв. №730/С-17062. Ограждение здания заводоуправления** «Производство резиновых изделий, город Кричев ОАО «Белшина» по ул. Трудовой, 1 в г. Кричеве», наружная площадь – 148 кв. м, материал – плита железобетонная, кирпич.
**Капитальное строение с инв. №730/С-17063. Ограждение здания заводоуправления** «Производство резиновых изделий, город Кричев ОАО «Белшина» по ул. Трудовой, 1 в г. Кричеве», наружная площадь – 240 кв. м, материал – железобетон.
**Капитальное строение с инв. №730/С-17065. Подъездная дорога к зданию заводоуправления** «Производство резиновых изделий, город Кричев ОАО «Белшина» по ул. Трудовой, 1 в г. Кричеве», наружная площадь – 1234 кв. м, материал – асфальтогранулят.

***Начальная цена продажи: 549 089,24 белорусских руб. с учетом НДС; сумма задатка – 54 908,92 бел. руб.***

| | |
|---|---|
| **Продавец** | ОАО «Белшина», УНП 700016217, Могилевская обл., г. Бобруйск, Минское шоссе |
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, МФО BIC банка BPSBBY2X |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 27 декабря 2017 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 26 декабря 2017 года до 15.00 |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | В течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона с победителем заключается договор купли-продажи. Оплата производится на условиях заключенного договора купли-продажи |

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: (8 0222) 72-41-14, 8 029 624-26-25, 8 044 738-18-99**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); представившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юридические лица Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации, копии учредительных документов, копию документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; индивидуальные предприниматели Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации и документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; – физ. лица – паспорт, представители физ. лиц и индивидуальных предпринимателей – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; иностранные юридические лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранные индивидуальные предприниматели – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представители иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованную в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.
Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условие – наличие не менее 2 участников. Единственный участник имеет право приобрести объект по начальной цене, увеличенной на 5%.
Участник, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в соответствии с выдаваемым счетом-фактурой




## ЖЫВУЧЫ ВЯПРУК

Некалі ў нашых вёсках людзі былі маладзейшыя. Ва ўсякім разе амаль усе яны трымалі кароў. А ўжо свіней дык сам бог загадаў: рохкалі на падворках... Нават у самых нядбаліц-гаспадынь, бо, па-першае, «так трэба было», а па-другое — выгадна: трохі варанай бульбы, трохі нейкай мукі, малака, рэштакі ежы — глядзіш — парася і падгадуецца, можна ўжо нейкай лебяды падмешваць ды конскіх «булачак».

Па восень гэту «харчовую дабаўку» пасылалі звычайна малых.

А ўжо тыя альбо на дарогу ішлі (у модзе быў гужавы транспарт), альбо на канюшню, альбо на луг, дзе коні пасвіліся. Нейкі з іх хвост падняў — малыя да яго, з вёдрамі...

Працавалі, карацей, нават дзеці — дапамагалі карміць свіней. І не дарма, бо з прыходам першых маразоў адкрываўся сезон «забойстваў», сезон самай рознай смакаты.

Да яго вяскоўцы рыхтаваліся загадзя: вастрылі нажы, куплялі соль ды розныя прыправы, вымывалі патрэбны посуд, для смалення падбіралі салому (сала тады было мякчэйшае, з водарам збажыны). Але найперш — дамаўляліся з майстрам.

Іх, «спецыялістаў па забоі», у нашых ваколіцах было няшмат. І кожны меў свой адмысловы «почырк», свой інструмент, нават сваю чаргу.

Трэба сказаць, што мы ў ёй ніколі не «стаялі», бо свінабояў мелі сваіх. Спачатку гэта быў дзед Хведар — вялікі, таўстаносы, гумарны — муж роднай бацькавай цёткі. А потым, калі ён пастарэў, прыходзіць стаў дзядзька Ваня — мясцовы каваль і бацькаў дружбак. Ён быў самы аўтарытэтны сярод свінабояў. Магчыма, таму што рабіў сваю справу неяк вельмі «гуманна»: падыходзіў да ахвяры (на задняй назе ўжо была вяроўка), нахіляўся, адной рукой ласкава чухаў яе за вухам, другой — пасля рэзкай падсечкі — наносіў удар швайкай і... усё. Што здзіўляла — амаль ніякага піску ды віску.

Збой у дзядзькі атрымаўся толькі аднойчы.

Галоўнае, пачыналася ўсё як заўжды: «вушка» (чытай — знаёмства з «ахвярай»), падсенне яе з капытоў, удар... Справа зроблена — парсюк гатовы.

Бацька з дзядзькам тады ў хату. У іх, паводле рэгламенту, снеданак з «грамулькай» спіртнога ды кароткая размова. А потым — час ісці на вуліцу, пачынаць смаліць.

Праўда, каго, калі парсюка... няма, і нават следоў (на двары падмарозіла, але снег не выпаў) — таксама... Няйначай містыка нейкая: бацька моўчкі глядзеў на дзядзьку, дзядзька — на бацьку...

А ён — трэба сказаць — працаваў у калгасе брыгадзірам. І на работу ў той дзень, вядома ж, не пайшоў. Калегі чулі, што адпрошваўся, ведалі, для чаго, а тут яшчэ і... убачылі, бо той «заколаты» дзядзькам парсюк са швайкай пад левай лапаткай... прышоў у двор канторы (ад нас гэта блізка) на ранішні нарад...

Карацей, шукаць гаспадароў гэтай жывёліны спецыялістам доўга не прыйшлося: вепрука пацізу прыгналі ў двор.

Дзядзька Ваня, гледзячы на гэту «працэсію», вельмі здзівіўся: загаварыў быў, што ў парсюка няйначай два сэрцы.

Але ж другое шукаць не давялося: вяпрук, апынуўшыся дома, яшчэ раз выцягнуў ногі. На гэты раз — ужо канчаткова. А далей...

Бацька з дзядзькам яго асмалілі, ускрылі грудзіну, і ўсе мы ўбачылі, што падстаў для сенсацыі, на жаль, ніякіх: сэрца адно. І «швайка» ў яго трапіла. А таму аўтарытэт каваля амаль не пахіснуўся.

**Іван Гаральчук,** *г. Мінск.*

## «ТЫ СПАЧАТКУ ПАГЛЯДЗІ...»

Можа, памыляюся, але ўперад розныя крылатыя-кусачыя (тыя ж восы ды шэршні) так нахабна сябе не паводзілі, на людзей, ва ўсякім разе, не нападалі, ім не шкодзілі. А пчолы дык наадварот — заўжды памагалі (хто не лячыўся ліпавым мёдам, пяргой ці прапалісам?).

Цяпер жа ў прыродзе, у народзе, мусіць, шмат што змянілася. Знаёмы дырэктар СВК расказваў, што нядаўна ў кантору прыехаў і, можна сказаць, яшчэ дзвярэй не зачыніў, чуе — пажарная некуды ляціць. «Што за ліха, — думае, — я ж толькі што сам руліў па вуліцы, усё спакойна было».

Адным словам, ускочыў ён у машыну і следам за пажарнымі...

Бачыць, яны каля хаты адной спыніліся, дзе зноў жа ніякага агню, ды што там — нават лёгкага дыму.

Тады, думае, навошта ехаць?

Аказалася, у тую хату рой пчол заляцеў. І галоўнае, дзе месца знайшоў? На задняй сценцы тэлевізара. Гаспадыня як згледзела, дык ледзь не самлела. Пабегла ратавальнікаў выклікаць...

А да дзядзькі аднаго «клубок» шэршняў у хату заляцеў, на сталі «пасяліўся». А ўжо гудзеў — не раўнуючы, як той млын: усіх з хаты выжыў...

На дапамогу зноў прыйшлі ратавальнікі: без бяды абышлося.

А вось тут ужо яна пад носам была — літаральна.

Хата бабулі Акуліны ў цэнтры вёскі стаяла, зямлі пры ёй з паўгектара было. Сад там рос, агарод. Але ж часы мяняліся. Начальства шукала месца, каб новую краму паставіць. А дзе яно, самае бойкае? Ну вядома ж, на скрыжаванні вуліц, на сялібе ў Акуліны.

У выніку частку агарода з пладовымі дрэвамі ёй прыйшлося аддаць.

Зрэшты, згоды, мусіць, ніхто і не пытаўся: адрэзалі ды ўсё. Добра, што дрэвы не ўсе спілавалі: пару антонавак пры хаце пакінулі, адну бэру. Вось гэтыя ігрушы — мяккія, сакаўныя — гаспадыня найболей цаніла, бо «якраз па зубах».

Пад той жа ігрушай яна, дарэчы, і столік з лаўкай паставіла, каб можна было пасядзець калі, адпачыць.

Сама, праўда, гэта рэдка рабіла — ёй вечна часу не было, а вось мясцовыя выпівакі — наадварот...

У той вераснёўскі дзень яны пад ігрушу ўтрох прыйшлі.

— Бабуля, дай што на закуску, — папрасіў адзін.

— А бэр вам што — мала? — абурылася гаспадыня. — Вунь іх колькі нападала. Бярыце ды ешце.

Хлопцы ад слова — пасталі вакол стала, выпілі па першай. Высачэнны, як той жыраф, Вадзім сагнуўся, усёй пяцярнёй цопнуў з пад ног найлепшую грушу і хоць бы цэрануў крыху, — адразу ў рот.

Паклаў, а закрыць яго, можа, і не паспеў: высунуў язык, зароў, замітусіўся, замацюкаўся, папрасіў вады...

І напіўся як быццам (студня побач), але ж ад гэтага лягчэй не стала: язык пачаў распухаць, дзеравянець, не даваў хлопцу дыхаць. Прычым развівалася ўсё гэтак хутка, што Вадзімавы сябрукі толькі вачыма лыпалі...

На шчасце, паблізу была бабка Акуліна. І, зноў жа, на шчасце машына хуткай дапамогі, куды яна пазваніла, якраз вярталася з выкліку з суседняй вёскі. Факт, што медыкі ўмомант аказаліся побач з Вадзімам.

...Мусіць, трэба жыць гэтаму чалавеку: зрабілі нейкі ўкол, адратавалі.

Думаеце, пасля гэтага ён кінуў выпіваць? Не. Але ж кожнаму, з кім закусваў, на ўсякі выпадак казаў: «Ты спачатку пагледзі, а ў рот потым пакладзі...»

Гэтае правіла ён засвоіў ад медыкаў.

**Ніна С.,** *г. Барысаў.*

## МАНЯ ВЫЛЕЧЫЦЬ...

Свет змяніўся, гэта я дакладна ведаю. Ён нават смяецца ўжо інакш. Заўважылі: як з некага, дык толькі дай, а як з сябе, любімага — крый божа.

А раней жа не так было: здарыцца нешта камічнае, чалавек адразу ж раскажа, каб усе пасмяяліся. І ён — таксама, нават з сябе. Вось як наша Маня.

Працавала яна ў паляводчай брыгадзе, і ўсё ў яе было як ва ўсіх (ці ў многіх): сям'я, муж, хата і ў хаце... Бо ўжо і ўзрост: у кожнага з сужэнцаў свой жыццёвы багаж, у кожнага свае правы, у тым ліку — і на іншага. У мужа, напрыклад, было права выпіць, «якое не магла парушаць ніякая баба». Жонка ў сваю чаргу мела права яго «пілаваць»... І, вядома ж, шкадаваць, а тым больш у хваробе, бо муж тады рабіўся ніякім, нават праўкой сваіх не «качаў».

Ну дык вось аднойчы (Маня сама расказала) пражыла з Лёшам дзень, вечарам завалілася спаць. Ужо і заснула б (ведама, змарыўшыся), але побач муж — усё нешта стогне, варочаецца. Кажа нарэшце:

— Нешта мне жывот баліць.

«Можна падумаць, што гэта ўпершыню. Як падап'е, дык вечна ў яго то панос, то залатуха», — падумала Маня, а ўголас буркнула:

— Халера з ім, з тваім жыватом. Пабаліць ды зараз перастане.

Але муж хвілін праз колькі зноў:

— Не перастае, Маня... Рэжа, як нажом. Можа, ты мне таблетак якіх падала б?

— Не маленькі — сам устань ды вазьмі, — загадала жонка. — У шуфлядцы, чорныя такія (вугаль значыць).

Лёша са стогнамі падняўся, папоўз да буфета, адчыніў шуфлядку і знойку голас падае:

— Маня, а Маня, а як іх піць? Яны ж вялікія, у глотку не ўлезуць.

Маня з той злосці:

— Як на гарэлку, дык глотка ў цябе шырокая — шклянкамі заліваеш. А як таблетачка, дык ужо не лезе! Раскусі, калі табе вялікая, ці разламі.

Муж, як відаць, гэтак і зрабіў, бо Маня ж трэба слухацца, Маня ж ведае.

А потым да ложка прытупаў, пабач лёг. Але ж не супакоіўся, наадварот — завойкаў яшчэ больш:

— Маня, а Маня, нешта ў мяне кішкі як агнём гараць. Можа, ты доктара паклікала б?

Тут ужо Маня ўсхапілася, уключыла святло, глянула на мужа і ледзь не самлела: рот у яго быў... зялёны-зялёны. Якраз у такі вось колер яна спадніцу фарбаваць збіралася — адмысловай фарбы купіла (у «таблетках», па пятаку) ды паклала ў шуфлядку. Лёша, выходзіць, пераблытаў, і што — атруціўся?

Маня куляй паляцела па доктара.

Той, дзякаваць богу, у нас чалавекам быў: ад слова прыйшоў, выслухаў-агледзеў хворага, потым доўга «паласкаў» яго і зверху, і знізу — аж да чыстай вады.

А назаўтра яшчэ і ў паліклініку адправіў, каб аналізы паздаваў, бо хто яго ведае — жывот анілінам яшчэ ніхто не лячыў. Апроч Мані.

А ўжо яна дык «ратавала» потым не толькі мужа: усім, хто скардзіўся на жывот, у вёсцы яшчэ доўга казалі: «Табе да Мані трэба... Маня абавязкова вылечыць».

**Соф'я Кусянкова,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў

## ВАЙБЕР СЦЕРПІЦЬ?



### Інфармацыйнае грамадства як «баі без правілаў»

Не ведаю, як вы, а я вельмі не люблю быць неспадзяванай сведкай рознага кшталту канфліктаў і скандалаў. Стаіш убаку, назіраеш за ўсім з ніякаватай усмешкай, і ўмяшацца хочацца — сказаць штосьці прымірэльнае («Рабяты, давайце жыць дружна!»), а не можаш, бо, калі на тое пайшло, гэта абсалютна не твая справа. Махаеш рукой і па магчымасці стараешся хутчэй канфліктную прастору пакінуць.

Я нядаўна трапіла ў такую вось прастору віртуальную. Знаёмая памылкова ўключыла мяне ў вайберы ў групу бацькоў аднаго сталічнага дзіцячага сада. У прынцыпе, мне б адразу праявіць далікатнасць і з той не маёй групы выйсці. Але тут пачалася найцікавейшая і вельмі паказальная перапіска паміж яе ўдзельнікамі, якія так захапіліся ёй, што не заўважылі старонняга чалавека. Ну, а старонні чалавек сцішыўся і стаў за ўсім дзействам назіраць — прафесійная цікаўнасць узяла верх над прыстойнасцю. Зрэшты, шчыра прызнаюся, зусім за тое не сорамна. Бо, высвятляючы адносіны на прасторах глабальнага сеціва, ды яшчэ ў адкрытай групе, трэба ведаць, што гэта па сутнасці тое самае, як рабіць гэта на людной вуліцы або ў грамадскім транспарце — абавязкова знойдуцца цікаўныя разявакі.

Карацей, размова там ішла пра навагоднія падарункі для дзяцей. Хтосьці з руплівых сяброў бацькоўскага камітэта вывесіў на агляд фота рэкламы гэтых падарункаў: маўляў, хто хоча, закажыце сваім дзецям. Хтосьці падумаў, што гэта падарункі, якія будуць купляць арганізавана за сабраныя грошы, і стаў патрабаваць паведаміць, што менавіта ў тых пакунках ёсць. Высветлілася, што падарункі ўжо купленыя, а гэта рэклама — проста для тых, хто раптам захоча купіць цукеркі дзецям яшчэ і дадому. Тут знайшліся бацькі — размова ў сеціве пачала ажыўляцца, падцягнуліся іншыя ўдзельнікі групы — якія сталі пратэставаць супраць цукерак: маўляў, кожны год цукеркі, на іх у дзяцей алергія. Пасля бурнага абмеркавання (бо ў цукерак знайшліся і шматлікія прыхільнікі) хтосьці раптам рэзонна заўважыў: падарункі ж ужо купленыя!

І тут пачаўся сапраўдны тэатр — разанаўскі «Гараж» адпачывае. Асабліва дасталася бацькоўскаму камітэту, які гэтыя падарункі і купляў. І чаму не параіліся, што купляць, і куды ідуць сабраныя грошы, і ўвогуле, хто ў тым камітэце. Бацькоўскі камітэт у асобе адной жаночыні (той самай, што мела неасцярожнасць размясціць тую няшчасную рэкламу падарункаў) як мог адбіваўся з дапамогай яшчэ некалькіх мам, якія сталі на яго абарону. Хтосьці памяркоўна спрабаваў спыніць спрэчку: маўляў, што ламаць коп'і, падарункі ўжо купілі, і, калі б не гэта раптоўная віртуальная размова, усе, атрымаўшы іх, былі б урэшце задаволеныя, як і ў мінулым годзе. Хтосьці, каб разрадзіць атмасферу, выставіў фоткі з дзіцячага свята ў садку: маўляў, лепш на дзетак сваіх падзівіцеся! Нічога не дапамагло: найбольш упартыя, як дзятлы, дзяўблі сваё, зноў вяртаючыся да тэмы — не, ужо не цукерак у падарунках, а ні больш ні менш — даверу да бацькоўскага камітэта. Прычым некаторыя мамы ў тэрміновым парадку падключылі да групы і да дыскусіі цяжкую артылерыю — татаў. Якія рэдка, але трапна пачалі кідаць свае важкія меркаванні.

Увогуле, скончылася ўсё тым, што на наступным тыдні ў гэтым садку будзе бацькоўскі сход. Як вы думаеце, якая ў яго будзе тэма? Правільна — аб даверы бацькоўскаму камітэту і яго магчымым перавыбары. А пачыналася ўсё з абсалютна альтруістычнага жадання адной жыццёва актыўнай кабеты падзяліцца карыснай інфармацыяй з тымі, чые малыя ходзяць у адзін садок з яе дзіцем...

Ад гэтага захапляльнага чытва вашаму староннняму назіральніку ў самым прамым сэнсе забалела галава, і я паспяшалася з той вайбераўскай суполкі рэціравацца, пакуль ніхто не заўважыў. А патрэбным напісаць пра гэты, прыватны і лакальны па сутнасці сваёй, канфлікт палічыла вось чаму. З'ява гэта становіцца тыповай, прынамсі ў гарадах, дый вёскі недалёка адышлі, бо мабільны інтэрнэт ёсць у кожным кутку краіны. І таму стварыць групу, аб'яднаную агульнымі інтарэсамі (напрыклад, дзецьмі — дзетсадаўцамі або школьнікамі), на бясплатнай агульнадаступнай інтэрнэт-пляцоўцы лічыць сваім абавязкам кожны класны кіраўнік, выхавальнік дзіцячага сада або актывіст бацькоўскага камітэта. Вельмі нават зручна — у плане агульнага апавяшчэння, калі трэба зрабіць нейкую аб'яву, арганізавана сабраць на нешта грошы і г. д. — не трэба тэлефанаваць кожнаму, кінуў паведамленне ў вайбер, і справа зроблена. Што і казаць — будуем інфармацыйнае грамадства. Але, на жаль, мы дагэтуль не зразумелі, што ў гэтым грамадстве павінна быць свая культура паводзін, свае правілы, свае табу. І калі цябе ў нейкай віртуальнай спрэчцы ніхто фізічна не можа перабіць ці, калі нарываешся, проста «заткнуць», гэта зусім не значыць, што табе дазволена ўсё, бо вайбер сцерпіць.

Сястра, у якой сёлета выпускны адзінаццаты клас у сталічнай гімназіі, актыўна выкарыстоўвае вайбер, прычым у іх агульная група — і бацькі, і дзеці. Дык вось, як яна расказвае, дзеці паводзяць сябе ў той групе больш прыстойна. Бацькі ж, асабліва не саромеючыся школьнікаў (ці, можа, не ўсведамляючы цалкам, наколькі публічны іх дыялог), пастаянна высвятляюць адносіны — адно з адным, з настаўнікамі, не выбіраючы выразы. І класны кіраўнік, як мадэратар групы, вымушана пастаянна іх папярэджваць аб прыстойных паводзінах, а асабліва заўзятых віртуальных крыкуноў, здарaецца, проста выдаляе з суполкі.

Ёсць яшчэ адзін адваротны бок гэтай агульнай інфарматызацыі: той, у каго няма сучаснага смартфона з падключаным інтэрнэтам, становіцца, можна сказаць, ізгоем, бо пра інфармаванне іншым спосабам ужо ніхто асабліва і не клапоціцца. Нядаўна, перад вялікімі лістападаўскімі святамі, знаёмая пацягнула свайго малога першакласніка ў суботу з прыгарада ў сталічную школу. А там, аказалася, у першым класе заняткі адмянілі. На цалкам абгрунтаваныя прэтэнзіі абуранай мамы настаўніца спакойна адказала: «Я ж паведамляла ўсім у вайберы». Тое, што ў мамы, якая выхоўвае сына адна, няма сучаснага дарагога тэлефона і, адпаведна, доступу да віртуальных аб'яў, нікога асабліва не хвалюе і не цікавіць.

У новага для нас слова «інфарматызацыя» няма сінонімаў «уседазволенасць» і «абыякавасць». Пакуль няма?

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

■

# КРЫЖАВАНКА



**ПА КРУГАХ: 1.** Лыжніца са снайперскімі звычкамі. **9.** Шапка польскага жаўнера. **10.** У ЗША — усе найвышэйшыя дзяржаўныя чыноўнікі. **16.** Нястомная працаўніца ў дзіцячым садку. **17.** Гармонія галосных, прыпадабненне афіксальных галосных каранёвым. **18.** Музычнае суправаджэнне спеваў. **24.** Навука аб паходжанні і эвалюцыі чалавека. **25.** Аўтамабільны «поні». **31.** Менавіта яго калісьці называлі «борзапісец», «хуткапісец».

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 4.** Паэт Беларусі, якому прысвоена званне народнага ў 1962 годзе пасля Міхася Лынькова. **5.** Прыбор для вызначэння напрамку і хуткасці ветру. **11.** Яна мае жоўты колер у лідара велагонкі. **12.** Аўстралійскае сумчатае млекакормячае. **13.** Ружа позняй восені — так называюць часам гэтую прыгожую кветку дачнікі. **19.** Легендарнае возера на Беларусі, услаўленае ў баладах Адама Міцкевіча. **20.** Канаўка на паверхні глебы, зробленая плугам. **26.** Дакумент аб страхаванні жыцця, маёмасці. **27.** Ажурныя сеткаватыя вырабы для аздобы адзення. **28.** Вялікі плоскі кавалак каменю, металу. **32.** Металічная пласцінка для прымацавання дзвярэй да вушака. **33.** Рускі паэт, адзін з пачынальнікаў савецкай дзіцячай літаратуры. Яго творы «Містар Твістэр», «Кошчын дом» і іншыя.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 2.** Беларуская гімнастка, першая алімпійская чэмпіёнка па мастацкай гімнастыцы. **3.** Драпежнік сямейства кашачых. **6.** Птушка берагоў Антарктыды. **7.** Адлегласць у 192 м 27 см, на якую спаборнічалі па бегу ў мінулым. **8.** Дзяржава са сталіцай Рабат. **14.** Асобны дробны свінцовы шарык для паляўнічай стрэльбы. **15.** Ударны музычны інструмент. **21.** Частковае вызваленне ад выканання асобных абавязкаў. **22.** Тоўстая наша маці, у яе лата на лаце (загадка). **23.** Частка плоскай фігуры, абмежаваная дугой і радыяльнымі лініямі. **29.** Асноўная адзінка мовы. **30.** Пладовае дрэва.

**Склаў Уладзімір ЕСМАНТОВІЧ,**
*г. Мінск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па кругах:** 1. Біятланістка. 9. Канфедэратка. 10. Магістратура. 16. Выхавальніца. 17. Сінгарманізм. 18. Акампанемент. 24. Антрапалогія. 25. Малалітражка. 31. Стэнаграфіст. **Па гарызанталі:** 4. Броўка. 5. Флюгер. 11. Майка. 12. Кенгуру. 13. Астра. 19. Свіцязь. 20. Баразна. 26. Поліс. 27. Карункі. 28. Пліта. 32. Завеса. 33. Маршак. **Па вертыкалі:** 2. Лобач. 3. Ягуар. 6. Пінгвін. 7. Стадыя. 8. Марока. 14. Шраціна. 15. Барабан. 21. Льгота. 22 Капуста. 23. Сектар. 29. Слова. 30. Груша.

## УСМІХНЕМСЯ

Аб'ява

*Сакавік.* Прадаю трох месячных шчанюкоў каўказскай аўчаркі. Вушкі купіраваныя. Такія лапачкі! $500 за штуку. Тэл. *****

*Красавік.* Прадаю трох двухмесячных шчанюкоў каўказскай аўчаркі. Прышчэпленыя. Разумненькія і ласкавыя, ядуць мала. $400 за штуку. Тэл. *****

*Май.* Прадаю трох трохмесячных шчанюкоў каўказскай аўчаркі. Тэрмінова! Выдатныя вартаўнікі! $300 за штуку. Куплю гаваджыя косткі ў неабмежаванай колькасці! Тэл. *****

*Чэрвень.* Людзі! Тэрмінова! Бясплатна! Аддам у добрыя рукі трох чатырохмесячных каўказскіх аўчарак! Танна прадаю сабачую поўсць! Тэл. *****

*Ліпень.* Аддам для доследаў або ў карэйскі рэстаран трох сук каўказскай пароды. У прыдачу 26 кілаграмаў сабачай поўсці бясплатна! Шукаю брыгаду будаўнікоў для рамонту кватэры (замена падлогі, рамонт сцен, замена дзвярэй). Тэл. *****

*Жнівень.* Прадам тры пудзілы сабак пароды каўказская аўчарка. Куплю корань валяр'яны, корань беладонны і іншыя заспакаяльныя травы. Тэл. *****



caricatura.ru

Даты | Падзеі | Людзі

## 24 ЛІСТАПАДА

**1859** год — у кніжных крамах Лондана ў продажы з'явіўся зялёны томік кнігі Чарльза Дарвіна пад назвай «Паходжанне відаў шляхам натуральнага адбору, або Захаванне спрыяльных рас у барацьбе за жыццё», у якой асноўнай рухаючай сілай эвалюцыі Дарвін назваў натуральны адбор і нявызначаную зменлівасць. Велізарны па тых часах наклад кнігі ў 1250 асобнікаў быў раскуплены за дзень, які адзначыў сабой з'яўленне ў сусветнай навуцы тэорыі эвалюцыі жывой прыроды, якая стала краевугольным каменем сучаснай біялогіі, або дарвінізму.

**1872** год — нарадзіўся Георгій Васілевіч Чычэрын (1872—1936), савецкі дзяржаўны дзеяч, дыпламат, у 1918—1930 гадах — наркам замежных спраў РСФСР, СССР. Падпісаў Брэсцкі мір, кіраўнік савецкай дэлегацыі на Генуэзскай (1922), Лазанскай (1922—1923) канферэнцыях.

**1895** год — нарадзіўся Мірон Ільіч Глобус, вучоны, вынаходнік, дацэнт ленінградскай Артылерыйскай акадэміі. У гады грамадзянскай вайны, у жніўні 1920 года, быў на Паўднёвым фронце ў якасці памочніка камандзіра асобнай батарэі 20-й Маскоўскай брыгады курсантаў. Удзельнічаў у ваенных аперацыях на Кубані, у Дагестане, Баку. З 1935 года — дацэнт кафедры ўнутранай балістыкі Артылерыйскай акадэміі. Апублікаваў больш за 20 тэарэтычных работ, атрымаў патэнты на 25 вынаходак, у тым ліку на аўтаматычнае ўзбраенне для самалётаў. У 1937 годзе арыштаваны і ў гэтым жа годзе расстраляны.

**1902** год — нарадзіўся (в. Баруны, цяпер у Ашмянскім раёне) Мікалай Сямёнавіч Арэхва, дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, гісторык, заслужаны работнік культуры Беларусі.



У 1924 годзе — старшыня Часовага беларускага бюро ЦК РКСМ, першы сакратар ЦК камсамола Беларусі. З 1925-га быў на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі: сакратар Віленскага акруговага камітэта, член ЦК КПЗБ. У 1926-м быў арыштаваны і 5 гадоў правёў у польскіх турмах. У часы Другой сусветнай вайны ваяваў у складзе Войска Польскага. У 1956—1984 гадах — навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ. Укладальнік зборнікаў дакументаў, аўтар успамінаў і даследаванняў па гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Памёр у 1990 годзе.

### Было сказана

**Берэс СКІНЕР,**
**амерыканскі псіхолаг:**
*«Існаваць дзеля самога сябе значыць быць нічым».*

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.53 | 16.59 | 8.06 |
| Віцебск — | 8.49 | 16.42 | 7.53 |
| Магілёў — | 8.43 | 16.48 | 8.05 |
| Гомель — | 8.33 | 16.52 | 8.19 |
| Гродна — | 9.07 | 17.15 | 8.08 |
| Брэст — | 9.01 | 17.23 | 8.22 |

## Месяц

*Першая квадра 26 лістапада.*
*Месяц у сузор'і Вадалея.*

## Імяніны

*Пр.* Сцепаніды, Вікенція, Віктара, Лукі, Сяцпана, Фёдара.
*К.* Флоры, Эмы, Рамана, Францішка, Яна.



Зіма хутка! Уцепленыя скульптуры можна ўбачыць у многіх месцах Мінска. Прымераў шалік і бронзавы «Паштальён», які знаходзіцца насупраць кінатэатра «Кастрычнік».

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

# ЗАЎТРА









## Пачым сёлета ёлкі?

Ёлачныя кірмашы пройдуць у Мінску з 22 па 31 снежня ва ўсіх раёнах сталіцы, паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама. Кошт жывых ёлак складзе: вышынёй да метра — ад 10 да 22 рублёў, да двух — ад 11,5 да 26 рублёў, да трох — ад 15 да 30 рублёў. Штучныя дрэвы будуць каштаваць: вышынёй да 50 сантыметраў — ад 3,65 да 8,3 рубля, да метра — ад 10,3 да 39 рублёў, да двух — ад 22,14 да 299,7 рубля, да трох — ад 128 да 347,65 рубля, вышэй за тры — да 500 рублёў. У прыватных прадаўцоў у Мінску кошт можа адрозніввацца — як у большы, так і ў меншы бок.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4368.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 23 лістапада 2017 года.